№ 14 (564) 10 красавіка 2008
www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі



**Народжаную ў савецкім вайсковым гарадку ў Вугоршчыне дачку афіцэра-расейца судзілі ў Полацку за прыналежнасьць да «Маладога фронту». «Калі жадаць адраджэньня беларускай культуры і мовы і сумленных выбараў — злачынства, то я прызнаю сваю віну», — сказала Кася Салаўёва ў апошнім слове. Адзін працэс Салаўёвай, Атакулавай, Кіма абвяргае ўсе стэрэатыпы пра нацыянальны рух і апазыцыю, якія навязваюцца прапагандай. Старонка 10.**

**На фота: Кася Салаўёва і яе маці Алена.**

## Агалцелыя нацыяналісткі

## У НУМАРЫ

### Забойчая статыстыка

Забойстваў, у пераліку на 100 тысяч насельніцтва, у Беларусі зьдзяйсьняецца аж у 8 разоў больш чым у Польшчы! **Старонка 3.**

### 100 дзён Белсату

Інтэрнаўты рэзка крытычна выказваюцца пра Белсат. Кіраўнічка Белсату: На «Сырыюсе» будзем з восені. **Старонка 4.**

### Так робіцца гісторыя

Скандал у Горадні: гісторыкі байкатуюць афіцыйную канфэрэнцыю ў знак салідарнасьці зь «нячэснымі» калегамі. **Старонка 6.**

### З дуляй у кішэні ды сініцай у руцэ

Рэйтынг афіцыйнага кіраўніка трымаецца, але вырасла і колькасьць прыхільнікаў беларусізацыі і дэмакратычных каштоўнасьцяў. Камэнтуе Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 12.**

### Украіна цягам трох гадоў скончыць перавод усіх ВНУ на ўкраінскую

Пра гэта заявіў міністар адукацыі і навукі гэтай краіны. **Старонка 2.**

# Украіна цягам трох гадоў скончыць перавод усіх ВНУ на ўкраінскую

Пра гэта заявіў міністар адукацыі і навукі гэтай краіны.

«Без гістэрыі з аднаго і другога боку расейскую мову трэба прыбраць з ВНУ, што і будзе зроблена за тры гады», — сказаў міністар.

Ён адзначыў, што «схаваная русіфікацыя» ў сыстэме вышэйшай адукацыі ва Ўкраіне застаецца праблемай. Зьмяніць сытуацыю можна будзе, у прыватнасьці, з укараненьнем незалежнага тэставаньня пры паступленьні ў ВНУ.

Іван Вакарчук сказаў, што ні ў якім разе ня будуць прымушаць пераходзіць на ўкраінскую мову выкладчыкаў у гадах. Да сыходу на пэнсію ім дазволяць выкладаць па-расейску, а вось моладзі мусова вучыць украінскую.

Дарэчы, Вакарчук — бацька саліста вядомай музычнай групы «Акіян Эльзы».

Украінізацыя адбывалася паступова. На 1990 год, пад канец СССР, толькі 5% студэнцкіх групаў у ВНУ займаліся па-ўкраінску. Да 1996 году, па меры рэалізацыі Закону аб мовах, гэтая лічба дасягнула 50%. Палітыка у сфэры адукацыі была пасьлядоўнай, не залежала ад пераменаў на вяршыні ўлады. У 1999 годзе, калі пераабралі Кучму, на нацыянальнай мове вучылася 66% усіх студэнцкіх групаў. На сёньня іх 85%. Толькі ва ўнівэрах Крыму і Данбасу пераважае дагэтуль расейская мова.

**АГ, МБ**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Як па-Вашаму, ці канфлікт Беларусі з Захадам давядзе ўрэшце да эканамічных санкцый Эўропы супраць Беларусі?**

| | |
|---|---|
| думаю, так | 170 (42.6%) |
| думаю, не | 106 (26.6%) |
| так, але яшчэ ня хутка | 89 (22.3%) |
| хутчэй Беларусь з Расеяй увядуць санкцыі супраць ЭС | 34 (8.5%) |

Усяго прагаласавала: 399

## Нашаніўцы ў Менску

**25 сакавіка на менскай сядзібе Таварыства беларускай мовы (вул.Румянцава, 13)** адбудзецца сустрэча пісьменьніцы Наталкі Бабінай з чытачамі і прэзэнтацыя яе раману «Рыбін горад». Удзельнічаюць таксама рэдактары і аўтары «Нашай Нівы» і ARCHE. **Пачатак у 18.30.**

## Рэдактары «НН» і ARCHE ў Пецярбургу

30 сакавіка споўнілася 75 год гісторыку і кандыдату мэдычных навук Валянціну Грыцкевічу. Беларускае грамадзка-культурнае таварыства ў Пецярбургу прысьвяціла гэтай падзеі спэцыяльнае пасяджаньне. На сход прыехалі й госьці зь Менску — Валер Булгакаў і Андрэй Скурко. Яны ўручылі патрыярху беларускага Пецярбургу прэмію часопісу ARCHE «За сумленнае слова» за 2007 год. Адбылася зацікаўленая гутарка.

**Мікола Нікалаеў**

## СЬЦІСЛА




PHOTO.BYMEDIA.NET

### Цяпло!

У чацьвер месцамі тэмпэратура дасягне + 20. Агулам 10—11 красавіка па краіне чакаецца пераменная воблачнасьць. Месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпэратура паветра ноччу плюс 5—11°С, днём плюс 11—17°С, па паўднёвым усходзе да плюс 20°С.

### Wi-Fi — у камэрцыйную эксплюатацыю ўжо ўлетку

Камэрцыйная эксплюатацыя бяздротавага доступу ў інтэрнэт пачнецца ў Беларусі ўжо ўлетку 2008 г. Рашэньне пра пачатак камэрцыйнай эксплюатацыі выклікане ростам попыту. На сёньня ў краіне працуе 115 пунктаў Wi-Fi-доступу бясплатна.

### Улады Вэнэсуэлы забаранілі «Сымпсанаў»

Улады Вэнэсуэлы прыбралі з тэлеэтэру амэрыканскі мультфільм The Simpsons, патлумачыўшы, што ён патэнцыйна шкодны для дзяцей. Замест яго будуць паказваць паўтор сэрыялу «Выратавальнікі Малібу».

**Ба-я**

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84

# Забойчая статыстыка

Забойстваў, у пераліку на 100 тысяч насельніцтва, у Беларусі зьдзяйсьняецца аж у 8 разоў больш чым у Польшчы!

Улады сьцьвярджаюць, што Беларусь зьяўляецца адной з самых спакойных і бясьпечных краін сьвету. Аднак гэты тэзіс абвяргае нават афіцыйная статыстыка.

Нядаўна ў Беларусі была абнародаваная статыстыка наўмысных забойстваў, зьдзейсьненых у 2007 годзе: за гэты пэрыяд іх было 791. У параўнаньні з папярэднім годам гэтая сумная лічба вырасла, бо тады ахвярамі забойстваў сталі 725 беларусаў.

Усяго, паводле афіцыйных зьвестак пракуратуры Беларусі, у 2006 годзе было зарэгістравана 946 забойстваў і замахаў на забойства. Атрымліваецца, што на 100 тысяч чалавек у нашай краіне прыпадала 9,68 такіх злачынстваў. Гэта, паводле зьвестак ААН, выводзіць Беларусь у першыя пазыцыі ў сусьветным «рэйтынгу» крымінагеннасьці.

Хаця пакуль ня ўсе краіны абнародавалі свае зьвесткі па забойствах за 2006 і 2007 гады, усё ж можна правесьці некаторыя параўнаньні.

### Пракляцьце вялікіх краінаў

Лідэрам у невясёлым рэйтынгу застаецца Паўднёвая Афрыка. У 2006 г. на 100 тысяч чалавек там прыпала 43,4 забойствы (агульная іх колькасьць перавысіла 19 тысяч). У параўнаньні з папярэднімі гадамі значна ўзрасла колькасьць забойстваў і на Ямайцы. У 2006 г. на 100 тысяч чалавек там прыпадала каля 49 забойстваў. У сувязі з гэтым экспэрты параўноўваюць крымінальную статыстыку гэтых краінаў з узроўнем злачыннасьці ў гарачых кропках, дзе, да слова, колькасьць забойстваў на долю насельніцтва часам нават меншая.

Ня радуе статыстыка ў Бразыліі. Там на 100 тысяч чалавек — 24,8 забойстваў.

### Забойствы і сьмяротнае пакараньне

Значна меншая колькасьць забойстваў зафіксаваная ў разьвітых суседзяў. Да таго ж, калі верыць афіцыйным зьвесткам, з кожным годам гэтая колькасьць скарачаецца. У 2006 г. у ЗША на 100 тысяч чалавек прыпадала 5,7 забойстваў, у Канадзе — 1,8. Прычым наяўнасьць сьмяротнага пакараньня ніяк не карэлюе з колькасьцю забойстваў. У большасьці штатаў ЗША яно ўжываецца, ва ўсіх эўрапейскіх краінах — скасаванае. І ў Эўропе колькасьць забойстваў на галаву ніжэйшая.

Згодна з эўрапейскай статыстыкай за 2006 г., у Турцыі на 100 тысяч насельніцтва было зьдзейсьнена 5,47 забойстваў, у Баўгарыі — 2,49, у Македоніі — 2,19, у Фінляндыі — 2,12.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Спакойная Эўропа

У іншых краінах Эўрасаюзу колькасьць забойстваў на 100 тысяч чалавек не перавысіла двух. У выніку, колькасьць больш за адно і менш за два атрымалі Румынія (1,96), Люксэмбург (1,8), Бэльгія (1,6), Кіпр (1,78), Вугоршчына (1,75), Славакія (1,63), Харватыя (1,6), Ангельшчына (1,48), Партугалія (1,39), Францыя (1,38), Польшча (1,2), Гішпанія (1,175), Італія (1,14).

Роўна «адзінка» атрымалася ў Швэцыі. Рэкардсмэнамі ж па самай нізкай колькасьці забойстваў у Эўропе сталі Нідэрлянды (0,96), Нямеччына (0,88), Данія (0,82), Швайцарыя (0,79), Аўстрыя (0,73), Нарвэгія (0,71), Славенія (0,59).

Аніводнага забойства не было зафіксавана на Мальце і ў Ісьляндыі, вядомых на ўвесь сьвет сваёй прыязнасьцю.

### Краіны былога СССР

Лідэрамі ў «забойчым рэйтынгу» ў Эўропе зьяўляюцца краіны былога СССР, і яны ўяўляюць сабой жудаснае выключэньне з эўрапейскага правіла.

У 2006 г. у Расеі было зьдзейсьнена больш за 27 тысяч забойстваў — на 100 тысяч насельніцтва налічваецца 19,3. За ёй ідзе Беларусь (9,68). Далей Эстонія (8,85), Літва (8,4), Украіна (6,9) і Латвія (6,5).

Сацыёлягі тлумачаць гэта дэгуманізацыяй чалавека, якая адбывалася ў таталітарнай краіне, і разбурэньнем маралі ва ўмовах крывадушнае дыктатуры.

Па прызнаньні А.Лукашэнкі, ад 2001 году колькасьць злачынстваў у Беларусі вырасла на 70 %.

**МБ; паводле Юліі Аляксандравай, «Салідарнасць»**

# 100 дзён «Белсату»


PHOTO.BYMEDIA.NET

## Інтэрнаўты рэзка крытычна пра Белсат

Беларускамоўнае ТБ абавязанае быць больш старанным і перадусім даступным, пішуць камэнтатары аднадушна.

Апошнія навіны вакол польскага беларускамоўнага тэлеканалу «Белсат» выклікалі жывыя дыскусіі ў інтэрнэце.

Прайшло ўжо больш за 100 дзён ад пачатку вяшчаньня, а канал усё яшчэ застаецца недаступным для тэлегледачоў у Беларусі і вядзе мінімальнае інтэрнэт-вяшчаньне. Сайт «Белсату» па напаўненьні і апэратыўнасьці цягнецца далёка ззаду за большасьцю сайтаў Белнэту. Між тым, са словаў **дырэктаркі Агнешкі Рамашэўскай**, кошт вяшчаньня «Белсату» складае мільён даляраў штомесячна — гэта, бадай, больш, чым гадавы бюджэт усіх незалежных СМІ Беларусі, газэтаў і інтэрнэт-сайтаў, разам узятых.

Галоўным закідам інтэрнаўтаў «Белсату» застаецца незразумелы выбар спадарожніка: хіба што некалькі тысяч сем'яў маюць антэны, настроеныя на «Астру», між тым «Белсат» вяшчае менавіта на ім.

«Пасьля таго, як пачаў вяшчаньне на Беларусь спадарожнікавы канал «Белсат», галоўнае пытаньне да яго стваральнікаў было такое: чаму вы са спадарожніка «Астра», які ў Беларусі глядзяць адзінкі, не пераходзіце на «Сырыюс», які глядзяць дзясяткі тысяч? — піша ў сваім блогу на naviny.by **публіцыст Сяргей Дубавец**. — Адказам былі пасулы, маўляў, некалі пяройдзем. А самі сабе падумалі: пяройдзем і атрымаем статыстыку «пшык». І чым тады апраўдаем мільёны ўкладаньні ў канал?» Публіцыст папярэджвае: «адзіным апраўданьнем [эфэктыўнасьці каналу] можа быць рэйтынг».

«У тым выглядзе [у якім канал існуе], на «Астры» асабліва, з гэткім вэбсайтам — прабачце, але — гэта зьдзекі з ідэі. Каму патрэбен «Істфронт», цяжкая музыка

### Кіраўнічка «Белсату»: На «Сырыюсе» будзем з восені

У прэсе зьявілася інфармацыя пра закрыццё «Белсату». Называецца нават канкрэтны час — верасень. Ці сапраўды ёсьць пагроза, што ўвосень «Белсат» перастане існаваць?

**Агнешка Рамашэўская:** Гэта непаразуменьне. На дадзены момант мы праводзім перамовы з МЗС наконт датацый на гэты год. Наша аргумэнтацыя была наступнай: мы хочам рабіць добры канал, а калі рабіць яго за прапанаваныя нам грошы, то да верасьня яны скончацца, але ніхто ня мае намеру ў верасьні зачыняць канал.

**— Вялікую хвалю абурэньня ў Беларусі выклікаў той факт, што канал да гэтага часу не перайшоў на спадарожнік Sirius. У чым праблема, і калі чакаецца зьмена спадарожніка?**

**АР:** Пра гэтую справу я прачытала даволі шмат глупстваў, разам з выдумкамі спадара Зімоўскага. Вядуцца бізнэс–перамовы. Польскае грамадзкае тэлебачаньне TVP павінна падпісаць дамоўленасьць з прыватнай фірмай наконт шматгадовага выкарыстаньня спадарожніка. У сувязі з гэтым нам неабыякава, якой будзе гэтая ўмова. Да мінулага тыдня адбываліся перамовы з прадстаўнікамі фірмы–ўладальніка Sirius'у, і большасьць перашкод пераадоленая. На дадзены момант мы завяршаем фармуляваць дамову ў яе канчатковым выглядзе. Спадзяюся, што вельмі хутка мы яе падпішам. Калі дакладна? Цяжка сказаць, бо пазьней цытаты маіх словаў будуць раз–пораз узьнікаць у выпадку спазьненьня. Шматгадовы кантракт, які каштуе больш за 1 млн эўра, нельга падпісаць за тыдзень. Гэта нармальны працэс.

Ведаеце, усіх нельга задаволіць.

**— Ці сочыце вы за рэакцыяй гледачоў, за крытыкай каналу? Ці вядома, якая аўдыторыя «Белсату» і як людзі ўспрымаюць прадукцыю каналу?**

**АР:** Ведаеце, усіх нельга задаволіць. Адзін кажа, што цікава, іншаму не падабаецца. Гэта прынцып тэлебачаньня, і мы не выключэньне. Мы маем пляны па мадыфікацыі некаторых перадач, як напрыклад East Front. Намі зьнятыя добрыя дакумэнтальныя фільмы, здымаюцца чарговыя. Мы стараемся рабіць добрыя публіцыстычныя перадачы, часам нашы супрацоўнікі робяць памылкі, але 100 дзён для тэлебачаньня — няшмат. Вядомы польскі канал TVN24 выходзіў на простую дарогу цэлы год, а цяпер гэта самы папулярны інфармацыйны польскі тэлеканал. Увосень, калі мы ўжо будзем вяшчаць на спадарожніку Sirius, плянуем правесьці дасьледаваньне. Пакуль такія дасьледаваньні ня маюць сэнсу, цяпер мы можам правесьці так званы name recognition, каб праверыць, колькі людзей ведае, што мы ўвогуле існуем.

**Паводле belsat.eu**

на роднай мове, калі мо 20 тысяч чалавек разам глядзіць гэты канал?» — пытаецца **Юрась** у абмеркаваньні на сайце nn.by.

«Талеркі, на якіх стаяць па тры канвэртэры (галоўкі) на «Амас», «Хотбэрд» і «Сырыюс» (а іх абсалютная большасьць), ужо нічым не дапоўніш, установачнага месца проста няма! На тым жа «Сырыюсе» ды «Хотбэрдзе» процьма свабодных транспондэраў», — дае тэхнічную даведку **Руды**.

«Сэнсу ад каналу ніякага. Толькі паперацягвалі нармальных людзей у Польшчу», — з горыччу кідае інтэрнаўт **Макс**.

Пачакаць просіць інтэрнаўт **Маззі**, — блізкі да выдаўцоў «Белсату». «Справа ня ў грошах, грошы на «Сырыюс» ёсьць. Толькі справа ў варунках дамовы. Уладальнік спадарожніка хоча забясьпечыцца. Абвяшчэньне студэнскай даты было непатрэбным. Сёньня перамовы амаль скончаныя. У гэтым месяцы будуць навіны. Каму патрэбнае ТБ на роднай мове — не атакуйце нас. Людзям, сярод якіх маса энтузіястаў, якія старанна працуюць, ствараючы «Белсат», вельмі крыўдна бачыць такую рэакцыю. Мы толькі нарадзіліся, у школу пайшлі, а Вы нас нагамі».

**Pan Brudas** абураецца: справа ня ў грошах, справа ў стаўленьні да гледача. «Вы, напэўна, ведаеце, калі пачаў хоць неяк працаваць сайт. Адказу на пытаньні, дасланыя на яго, чакаю і дагэтуль. Посьпехаў!»

Тое самае піша **Aleś Jurkaviec**: «Справа ня ў тым, што ня ўсё ўдаецца, а ў самім стаўленьні да гледача. Наабяцалі шмат — практычна нічога ня выканалі. Трансьляцыю не маглі наладзіць адразу — дык хоць бы на сайце нешта тлумачылі, а не змушалі чуткі зьбіраць. А розныя парады наконт таго, што калі хочаце глядзець, то ідзіце і перанастройвайце антэны на «Астру», увогуле не разумею. Для каго гэты канал ствараўся — для апазыцыянэраў? Для ўжо даўно сагітаваных? Хіба такія толькі і пойдуць нешта рабіць з антэнай, каб мець магчымасьць глядзець менавіта Белсат. Простыя ж людзі могуць пачаць яго глядзець, толькі выпадкова наткнуўшыся і нечым зацікавіўшыся. А дзеля гэтага Белсат мусіць быць не на маргінальным для Беларусі, а на масавым спадарожніку, — піша інтэрнаўт і заклікае з вадой ня выліць дзіця. — Я думаю, эўрапейцы грошы мелі даваць не на абслугоўваньне патрэбаў вузкага кола заангажаваных людзей? Тады чаму ўсё так па-дурному робіцца?»

**Мікола Бугай**

### Зноў узяліся за спадарожнікавыя антэны

**Шмат хто зь менскіх уладальнікаў спадарожнікавых антэн атрымаў па пошце «прадпісаньні» ад жыльлёва-камунальных службаў — «у тэрміновым парадку» да 7 красавіка падаць дакумэнты, што дазваляюць усталяваньне «талерак» і кандыцыянэраў.**

**У выпадку невыкананьня пагражаюць прыцягненьнем да адміністрацыйнай адказнасьці паводле арт. 21.13 КаАП — «Парушэньне архітэктурнага рашэньня фасаду будынка альбо пабудовы».**

**На думку кіраўніка Цэнтру прававой дапамогі СМІ пры Беларускай асацыяцыі журналістаў Міхаіла Пастухова, нормы новага Адміністрацыйнага кодэксу могуць распаўсюджвацца толькі на падзеі, якія адбыліся пасьля ўступленьня кодэксу ў сілу — г.зн. 1 сакавіка 2007 году. То бок, патрабаваць зьняць антэны, усталяваныя раней, ЖЭСы ня маюць права.**

**ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»**

# Пуцін: «Украіна — гэта нават не дзяржава»

Крыніца газэты «КоммерсантЪ» у дэлегацыі адной з краінаў НАТО паведаміла, што прэзыдэнт Расеі Ўладзімір Пуцін на закрытым паседжаньні Расея—НАТО выказаў сумнеў адносна легітымнасьці дзяржавы пад назовам Украіна.

Пуцін намякнуў, што ў выпадку ўступленьня ў альянс Украіна можа спыніць існаваньне як адзіная дзяржава.

Ён паведаміў, што Масква ўспрымае набліжэньне НАТО да межаў як рэальную пагрозу інтарэсам дзяржавы і паабяцаў зрабіць адэкватныя захады. Прэзыдэнт Расеі намякнуў: калі НАТО выдасьць плян дзеяньняў па ўваходу ў сябры Грузіі, Расея прызнае Абхазію і Паўднёвую Асэтыю, на аснове косаўскага прэцэдэнту, і створыць буфэрную зону між НАТО і сваімі межамі.

«Пра Грузію расейскі прэзыдэнт гаварыў цалкам спакойна і нібыта між іншага. Калі гаворка пайшла пра Ўкраіну, Пуцін выбухнуў. Зьвяртаючыся да Буша, ён сказаў: «Ты ж разумееш, Джордж, што Ўкраіна — гэта нават не дзяржава! Што такое Ўкраіна? Частка яе тэрыторый — гэта Ўсходняя Эўропа, а частка, і значная, падараваная намі!» — заявіла крыніца.

Пуцін заўважыў: калі Ўкраіну прымуць у НАТО, яна проста спыніць існаваньне. «Фактычна, ён прыстрашыў, што Расея можа пачаць адасабленьне Крыму і Ўсходняй Украіны», — дадала крыніца газэты.

Перад журналістамі Пуцін назваў пашырэньне НАТО, што ўсё яшчэ працягваецца, праявай старой лёгікі, у сучасных варунках неактуальнай.

Нагадаем, віцэ-сьпікер Дзярждумы Ўладзімір Жырыноўскі, камэнтуючы магчымае ўступленьне Ўкраіны ў НАТО, заявіў, што калі б ён быў прэзыдэнтам, то зрабіў бы самыя жорсткія прэвэнтыўныя захады і дамогся б расколу Ўкраіны.

3 красавіка на саміце ў Бухарэсьце сябры НАТО перанесьлі прыняцьце канчатковага рашэньня пра далучэньне Ўкраіны да Пляну дзеяньняў па ўваходу ў сябры арганізацыі на сьнежань 2008 г. Разам з тым, у рэзалюцыі саміту НАТО гаворыцца, што Альянс гарантуе прыём Украіны ў НАТО.

Інфармацыя пра словы Пуціна выклікала стрыманую рэакцыю ва Ўкраіне. Хіба што палітычны сьвет Кіева і ня меў ілюзій што да палітыкі Масквы. Варта адзначыць, што тэма забесьпячэньня нацыянальнае бясьпекі праз уступ у альянс актыўна дыскутуецца і ўзровень падтрымкі ідэі ўступу ў НАТО расьце.

**Паводле korrespondent.net**



**Пасьля саміту НАТО ў Бухарэсьце прэзыдэнты ЗША і Расеі правялі сваю апошнюю сустрэчу на курорце ў Сочы.**

# Так робіцца гісторыя

Скандал у Горадні: гісторыкі ў знак пратэсту байкатуюць афіцыйную канфэрэнцыю.

10 красавіка ў мурах Гарадзенскага ўнівэрсытэту імя Янкі Купалы мае праходзіць канфэрэнцыя, прысьвечаная 880-годзьдзю Горадні. Паколькі канфэрэнцыя фінансуецца гарвыканкамам, складанне яе праграмы таксама праводзілася пад кантролем гарадзкіх чыноўнікаў. У выніку са складу ўдзельнікаў былі выкрасьленыя гісторыкі Алесь Смалянчук і Алесь Краўцэвіч, якія найбольш актыўна праявілі сябе ў справе абароны гістарычнага цэнтру Горадні.

8 красавіка справа атрымала нечаканы працяг. Некалькі гісторыкаў — Генадзь Сагановіч, Андрэй Кіштымаў, Вольга Сабалеўская, Эдуард Мазько, Іна Соркіна, Андрэй Чарнякевіч, Анатоль Трафімчык, Віталь Карнялюк, Сяргей Токць, Юры Гардзееў — у знак пратэсту вырашылі адмовіцца ад удзелу ў канфэрэнцыі ў знак салідарнасьці з Алесем Краўцэвічам і Алесем Смаленчуком. Пра гэта яны паведамілі на імправізаванай прэс-канфэрэнцыі ў аўторак. На думку гісторыкаў, сьпіс тых, хто адмовіўся, будзе расьці.

Андрэй Чарнякевіч, які выступаў ад імя гэтых гісторыкаў, зазначыў, што Смалянчук і Краўцэвіч шмат зрабілі для дасьледаваньня і абароны Горадні, і выдаленьне іх абуральнае, пагатоў канфэрэнцыя адкрытая і ўзяць удзел у ёй можа любы дасьледчык.

Таксама былі скрытыкаваныя закіды наконт палітызаванасьці меркаваных выступаў Смаленчука і Краўцэвіча. Алесь Смалянчук, напрыклад, падаў тэму дакладу «Горадня на старонках «Нашай Нівы».

У прыватнай гутарцы Алесю Смаленчуку сказалі, што рашэньне пра выкіданьне прымалася не кіраўніцтвам Гарадзенскага ўнівэрсытэту, а аддзелам ідэалёгіі гарвыканкаму.

У той жа час у размове з гісторыкамі начальнік ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму Сяргей Дубавец (цёзка знанага публіцыста) заявіў, што нічога ня ведае аб матывах адмовы і выказаў меркаваньне, што рашэньне аб выключэньні гісторыкаў было прынята ва ўнівэрсытэце. Ён парадзіў схадзіць да намесьніцы старшыні гарвыканкаму Сенчанковай. Да тае гісторыкаў, натуральна, не пусьцілі.

Затое ў ідэалягічным аддзеле яны пачулі сакрамэнтальнае: «Такія гісторыкі з такімі ведамі нашай краіне непатрэбныя».

Варта адзначыць, што начальнік ідэалягічнага аддзелу гарвыканкаму сам выпускнік гарадзенскага гістфаку. У 90-я ён пісаў патрыятычныя артыкулы ў навуковыя зборнікі.

**Ул.інф.**



**Алесь Краўцэвіч (справа), Алесь Смалянчук, Андрэй Чарнякевіч і Павал Мажэйка.**

## СЬЦІСЛА

### Клімковіч і Сьцяпан атрымалі прэмію за найлепшы гістарычны раман

Падведзеныя вынікі конкурсу гістарычнага раману. Яго ладзіла Таварыства беларускай культуры імя Ф.Скарыны г.Масквы супольна зь Беларускім ПЭН-цэнтрам. Як паведаміў старшыня журы, пісьменьнік Уладзімер Арлоў, найлепшым з выстаўленых на конкурс прызнаны раман «Цень анёла». Аўтары, Максім Клімковіч і Ўладзімер Сьцяпан, атрымалі ад беларусаў Масквы спэцыяльны прыз.

### Беларусь у International Film Guide

Пабачыў сьвет штогадовы брытанскі даведнік «Міжнародны кінагід» за 2008 г. Прэзэнтацыя адбывалася на Бэрлінскім фэсьце. У даведніку падаюцца асноўныя зьвесткі пра сусьветны кінапрацэс, распавядаецца пра фільмы, створаныя за апошні год у кожнай краіне. Артыкулы ідуць па альфабэце, Беларусь там стаіць між Бангладэш і Бэльгіяй. Артыкул напісаны для выданьня аўтарам «НН» Андрэем Расінскім. Беларускамоўны варыянт «Беларускае кіно на мяжы 2008» друкаваўся ў «НН» № 1’2008.

### Выйшаў CD «Беларускі Хрысьціянскі Гіт»

50 адабраных гітоў прайшлі ратацыю ў 10 хрысьціянскіх фокус-групах (праваслаўнай, рыма-каталіцкай, грэка-каталіцкай, баптысцкай і г.д.) — і вернікі самі адабралі 21 найлепшы сьпеў. Пачынаецца дыск гімнам «Магутны Божа»; завяршаецца — харавым «Ойча наш» Тут і Янка Купала («Хрыстос Уваскрос»), і Рыгор Барадулін («Ерусалім»), і Уладзімір Караткевіч («На Беларусі Бог жыве»). Многія сьпевы — поліканфэсійныя.

### Мазырчукі адстаялі свой мадэрн

Нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасьці будынку ў стылі мадэрн — двухпавярховаму цаглянаму жылому дому №28 па вул.Ленінскай у Мазыры. Ініцыятыва аховы будынку належыць суполцы “Таварыства аховы помнікаў”, старшынём якой зьяўляецца Павал Наздра.

**Ул.інф., Алесь Белазор, bchd.info**

# Sacrum et profanum

З нагоды скончанай галадоўкі братоў Скрабцоў піша **Анатоль Сідарэвіч**.

Нам, беларусам, памятная галадоўка 1903 г. у знакамітай пецярбурскай турме «Кресты», бо ў ёй браў удзел адзін з пачынальнікаў нашага нацыянальна-вызваленчага руху Іван Луцкевіч. Некаторыя схіляюцца да думкі, што менавіта ў «Крестах» Іван Луцкевіч падарваў сваё здароўе і што менавіта гэта абумовіла яго ранньюю — у 38 гадоў — сьмерць.

Нам вядомыя галадоўкі індыйскіх патрыётаў, якія пад кіраўніцтвам Махандаса Карамчанда Гандзі змагаліся супроць брытанскага панаваньня. У паваенны час мы былі сьведкамі трагедыі паўночнаірляндзкага патрыёта Робэрта (Бобі) Сэндса (ён памёр на 65-я суткі галадоўкі) і дзевяці ягоных таварышаў. Па «галасах» мы чулі пра галадоўку акадэміка Андрэя Сахарава, сасланага ў г. Горкі (Ніжні Ноўгарад) і пра тое, як яго гвалтам кармілі з дапамогай шлянгу.

Беларуская рэчаіснасьць лукашэнкаўскага пэрыяду прымусіла трымаць галадоўку вязьняў Юр’я Хадыку і Вячаслава Сіўчыка. Гэтая акцыя пратэсту была пасьпяховая: абодва вязьні «Валадаркі» выйшлі на волю. Каб прадухіліць галадоўку групы дэпутатаў Вярхоўнага Савету Беларусі XII скліканьня, Лукашэнка і яго памагатыя ўжылі гвалт да народных абраньнікаў. Мы ведаем,



што ў 1999 годзе ў ізалятары на вул.Акрэсьціна трымаў галадоўку і супраціўляўся гвалтоўнаму кармленьню Віктар Ганчар. Няма сумневаў, што мужныя паводзіны В.Ганчара шмат у чым прадвызначылі яго трагічнае «зьнікненьне». Сваёю 53-дзённаю галадоўкаю Аляксандар Казулін дамогся таго, што аб праблеме правоў чалавека ў Беларусі загаварылі на ўзроўні Рады Бясьпекі ААН.

Усе вызвольныя рухі ставіліся да галадоўкі як да сьвятога (sacrum). Галадоўкі пачыналіся з сур’ёзнымі мэтамі і намерамі; яны, як правіла, былі працяглыя. Галадоўкі часьцей за ўсё праводзіліся ў вязьніцах або ў публічных месцах. Гэта прадухіляла ўсякую магчымасьць інсынуацыяў у дачыненьні да галадоўшчыкаў з боку ўладаў. Гэта прымушала ўлады абоісьці на саступкі ўдзельнікам акцый, або ўжываць да іх гвалт. Гэта не давала мяшчанам магчымасьці кпіць з галадоўшчыкаў і распаўсюджваць пра іх усякія байкі.

У 2006 г. мы сутыкнуліся з новай зьявай. Нехта (гэта былі, здаецца, маладыя палітыкі з сацыял-дэмакратаў) прыдумаў эстафэтную галадоўку. Чалавек колькі там дзён галадае, за ім другі, за другім трэці…

Я ведаю галадоўкі, разьлічаныя на некалькі дзён (часьцей за ўсё на тры). Іх практыкуюць хрысьціяне, асабліва перад Пасхай. І называюцца яны шчырым постам. Пост гэты дапаўняецца малітвамі. Бывае, што хрысьціяне па некалькі дзён жывуць на адной вадзе, посьцячы ў нейкай інтэнцыі. Так, маці беларускай патрыёткі Надзеі Дземідовіч некалькі гадоў нічога ня ела ў серады і пятніцы, малілася, каб яе дачка вярнулася з ГУЛАГу, і Бог даў ёй пабачыць дачку на волі.

Хрысьціяне, посьцячы і молячыся, у адпаведнасьці з Хрыстовым наказам ня робяць гэта публічна. Нашы ж эстафэтныя галадоўшчыкі выстаўляюць сябе напаказ.

Сёлета зноў абвешчаная эстафэтная галадоўка. Мэты гэтай эстафэтнай галадоўкі заяўленыя сур’ёзныя, але форма і тэрміны яе правядзеньня аніяк не трывожаць уладу, даюць уладзе і грамадзянам (не абавязкова мешчаноце) падставы для кепікаў. Месцы правядзеньня эстафэтнай галадоўкі («каля халадзільнікаў», як жартуюць дасьціпнікі) таксама не надаюць ёй грамадзкай вагі. Эстафэтным галадоўшчыкам відавочна нестае мужнасьці Юр’я Хадыкі і Вячаслава Сіўчыка, Віктара Ганчара і Аляксандра Казуліна. Але самае галоўнае тое, што форма, тэрміны і месцы правядзеньня эстафэтнай галадоўкі зьніжаюць sacrum да profanum.

Трэба ў ветлівай форме папрасіць эстафэтных галадоўшчыкаў спыніць прафанацыю галадоўкі як сродку мірнага пратэсту і супраціву тыраніі.

### Адказвае Ігар Рынкевіч

**Што да прафанацыі сябрамі яго ж партыі галадоўкі ў форме эстафэты, то тут неабходна паспрачацца. Па-першае, у 2006 годзе ў такой эстафэце ўзялі ўдзел больш за 500 прыхільнікаў Казуліна ў Беларусі і за мяжой, што таксама паспрыяла спыненьню прафэсарам сваёй галадоўкі (у калёнію з гэтай навінай адмыслова дазволілі патэлефанаваць жонцы Ірыне). У той галадоўцы нават ўзялі ўдзел некаторыя апазыцыйныя лідэры з АДС. Цяпер некалькі дзясяткаў таксама далучыліся. Сапраўды, цяпер працягваецца праваслаўны пост. Але ці хадзіў Сідарэвіч з кожным галадоўшчыкам і бачыў стаўленьне кожнага да Боскай**


PHOTO.BYMEDIA.NET

**дапамогі? Можа, Сідарэвіч ведае, як у цяперашняй эстафэце галадала Надзея Батура, што малілася пры кожным глытку вады? Або ён бачыў Аляксандра Скрабца (за 3 тыдні ён страціў «каля лядоўні» больш за 20 кг сваёй вагі), які быў у Чырвоным касьцёле і маліўся за спачын душы І.Казулінай? Канечне, не. А наконт лядоўні… Ад сябе ня зьбегчы, схлусіш — і ня будзеш сам сябе паважаць. А менавіта такія людзі бяруць удзел у эстафэце галадоўкі. Я пішу гэтыя радкі на дзявяты дзень галадоўкі (10 кг страчанай вагі), але, як былы адвакат А.Казуліна, сваёй галадоўкай я кідаю выклік ганебнай прававой сыстэме, мацую салідарнасьць. І працягваю змагацца з тыраніяй у іншых формах… А вось ціхенька, непублічна рабіць такую акцыю супраціву — такога падарунку ўладам, як і крытыкам ад мешчаноты, мы ня зробім. І нарэшце, «ветліва» нас прасіць спыніць «прафанацыю» ня трэба, эстафэта спыніцца сама ад адмовы ва ўдзеле з боку такіх жа змагароў, як Сідарэвіч.**

**З павагай да чытачоў «Нашай Нівы»,**

**Ігар Рынкевіч**




# Браты Скрабцы, генэрал Фралоў і сорак прыхільнікаў яднаньня з Расеяй

Генэрал Бокаў назваў нацыянальную сымболіку «сьцягі паліцаяў і здраднікаў».

У Менску, у парку Дружбы народаў, 2 красавіка прайшоў мітынг у падтрымку аб'яднаньня народаў Беларусі і Расеі. На акцыю сабралася 30—40 чалавек. Сярод іх: браты Скрабцы, генэрал Валер Фралоў, намесьнік старшыні Партыі камуністаў Беларусі Алена Скрыган.

Удзельнікі акцыі трымаюць расьцяжкі: «Свабоду Казуліну» і «Россия, дай отдохнуть от АГЛ». Ёсьць бел-чырвона-белыя сьцягі з ружай (сымболіка БСДП) і расейскія дзяржаўныя.

Грае музыка. Гучаць песьні з рэпэртуара Віктара Цоя і «Акіяна Эльзы». Традыцыйнае пытаньне журналістаў: «А чаму не даюць цукерак?», застаецца пакуль без адказу.

На акцыі прысутнічае таксама паўтара дзясятка журналістаў.

Настрой ва ўсіх бадзёры, пазытыўны.

Пасьля мітынгу павінен пачацца канцэрт у знак салідарнасьці з палітвязьнямі.

***

**18.35.** Падышоў міліцыянт і папрасіў згарнуць расьцяжкі і схаваць сьцягі, паколькі яны не перадаюць сутнасьці заяўленага мерапрыемства — яднаньня з Расеяй. Што праўда, расьцяжкі схавалі.

Зьявіўся Сяргей Скрабец са сьцягам Тыбэту.

**18.38.** Пачаўся мітынг. Людзей паболела. За выняткам журналістаў, у парку Дружбы народаў — 50 чалавек. Але сярод іх хапае мінакоў, якія зь цікавасьцю назіраюць за сюжэтам акцыі.

**18.44.** Першым выступіў Сяргей Скрабец. Ён працытаваў спачатку словы БТ, якое калісь сказала, што ў Беларусі няма разумных палітыкаў, якія выступаюць за інтэграцыю з Расеяй.

«Няпраўда, — сказаў Скрабец, — яны тут, на гэтым мітынгу».

Таксама ён прапанаваў Лукашэнку і ўраду выбачыцца перад народам Расеі, перад Пуціным і Мядзьведзевым за той бруд, які ліецца на Расею з прапагандысцкіх каналаў.

Генэрал Валер Фралоў у сваім выступе згадаў, як добра жылося беларусам пры СССР, што БССР была тады ў прывілеяваным становішчы. А незалежнасьць зваліласся ў 1991 г. нечакана і дзякуючы Расеі, — сказаў генэрал. Ён таксама заўважыў, што летась на аналягічным мітынгу было толькі 12 чалавек. «Цяпер нас у некалькі разоў болей, а праз год будзе яшчэ болей».

**18.51.** Генэрал Бокаў з Партыі камуністаў, што выступаў наступным, адразу заявіў, што яму сорамна выступаць пад бел-чырвона-белымі сьцягамі, што лунаюць ля сцэны. «Гэта сьцягі паліцаяў і здраднікаў», — заявіў удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ён заклікаў маладых людзей пакінуць сцэну з нацыянальнымі штандарамі. Моладзь у адказ гукае: «Ганьба!» і «Жыве Беларусь!», але сы-






ходзіць.

Генэрал Бокаў таксама назваў сёньняшнюю нацыянальную апазыцыю эсэсаўскімі недабіткамі і заявіў, што Партыя камуністаў беларуская выступае за інтэграцыю з Расеяй.

Генэрал Фралоў паспрабаваў выбачыцца перад моладзьдзю за зьнявагу нацыянальных сымбаляў.

Журналісты паціху пачынаюць пакідаць «мерапрыемства».

**Зьміцер Панкавец**




**Генэрал Валеры Фралоў (справа), Аляксандар Скрабец і Ўладзімер Ніськюк (на другім пляне).**

# «Калі жаданьне адрадзіць мову лічыць крыміналам, то я сапраўды вінаватая»

8 красавіка ў найстаражытнейшым Полацку прайшоў крымінальны суд над 20-гадовай **Кацярынай Салаўёвай.**


УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

Этнічную расейку, ураджэнку вугорскага Вэспрэму, дачку пратэстанцкага пастара Салаўёву абвінавацілі ва ўдзеле ў незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт». Кася стала ўжо адзінаццатым сябрам «МФ», якую судзілі паводле славутага сухарэнкаўскага артыкулу 193 частка 1. Што праўда, за краты патрапіў толькі лідэр «МФ» Зьміцер Дашкевіч, іншыя абмежаваліся штрафамі і папярэджаньнямі.

Першапачаткова суд над Салаўёвай мусіў адбыцца 27 сакавіка, але быў перанесены амаль на два тыдні. Справа ў тым, што 25 Сакавіка падчас сьвяткаваньня ў Менску Дня Волі Кася была затрыманая і асуджаная на 5 сутак арышту.

Падтрымаць Салаўёву прыехаў Аляксандар Мілінкевіч зь Інай Кулей, старшыня аргкаміэту БСДП «НГ» Мікола Статкевіч, прадпрымальнік Алесь Макаеў, палітык Вячаслаў Сіўчык. Але на дзіва, усе яны зьніклі яшчэ падчас абедзеннага перапынку. Мабыць, у Менску іх чакалі больш пільныя справы, чым суд Салаўёвай. Да канца прабылі Павал Севярынец, Аляксей Шэін, Алесь Бяляцкі, Валянцін Стэфановіч. Агу-


ЗЬМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

**Праваабаронца Валянцін Стэфановіч (зьлева) і адвакат Аляксандар Галіеў.**


ЗЬМІЦЕР ПАНКАВЕЦ

**Судзьдзя Алена Марозава.**

Прапагандысты часта вінавацяць нацыянальны рух у «этнічным нацыяналізьме». Той самы «Малады фронт» як толькі не называюць. Такія сьцьверджаньні цалкам абвяргаюць расейка Кася Салаўёва, ці кіргізка Маўлюда Атакулава, якая за акцыю салідарнасьці ў Полацку правяла ноч у ізалятары, а на наступны дзень была аштрафаваная на 1 225 000 рублёў. Карэйскія карані мае і Андрэй Кім, які цяпер у СІЗА чакае суду. Беларускі нацыянальны рух мае грамадзянскі характар, і яднае людзей на грамадзянскай, а не этнічнай прыкмеце.

лам у Полацак з розных куткоў краіны прыехала больш за 60 чалавек.

Людзям, якія сабраліся на ганку суду, міліцэйскі маёр паведаміў, што на працэс выдзеленая маленькая заля, усяго на 15 месцаў, і папрасіў вызначыцца з тымі, хто будзе прысутнічаць на судзе. Але працэс пачаўся абсалютна без усялякіх абвестак і папярэджаньняў, у залю змаглі патрапіць толькі дзевяць чалавек. Нават бацькі Касі былі вымушаныя асабіста зьвяртацца да старшыні суду сп.Калесьніка. Менавіта для бацькоў і амэрыканскага дыплямата Люіса Крышака было зробленае выключэньне, іх запусьцілі ў залю падчас разгледжваньня справы. Большасьць жа журналістаў чакалі перапынку ў працэсе.

Фактычна ўсё абвінавачаньне ўбок Салаўёвай зводзілася да друкаваных матэрыялаў, якія былі канфіскаваныя падчасператрусу ў інтэрнаце ў лютым. Тады міліцыянты арыштавалі некалькі газэт, у тым ліку і зарэгістраваных, улёткі «МФ», дзе быў пазначаны нумар тэлефону Касі, а таксама рукапісны дзёньнік. У прыватным дзёньніку дзяўчыны мясцовыя сышчыкі знайшлі запіс: «Я зраблю ўсё магчымае, каб зьнішчыць гэты рэжым».

Сама Салаўёва не адпрэчвала свайго сяброўства ў «Маладым фронце», яна даводзіла, што арганізацыя неаднаразова падавала дакумэнты на рэгістрацыю ў Міністэрства юстыцыі, але пастаянна натыкалася на адмову. Дзяўчына казала, што ейныя дзеяньні скіраваныя ў першую чаргу на тое, каб зарэгістраваць «Малады фронт».

Пракурор Коласава сказала, што дзейнасьць абвінавачанай у незарэгістраванай арганізацыі цалкам даказаная, што зь лістапада 2007 па сёньня Салаўёва зьяўляецца сябрам «Маладога фронту», ведае пра мэты і задачы арганізацыі, а таксама прызнала, што распаўсюджвала літаратуру. Зьмякчальнай акалічнасьцю пракурор назвала прызнаньне падсуднай сваёй віны, а таксама тое, што яна ўпершыню прыцягваецца да крымінальнай адказнасьці. У якасьці пакараньня пракурор Коласава запатрабавала прызначыць Салаўёвай 200 базавых велічынь штрафу (7 млн рублёў).

Адвакат Касі Аляксандар Галіеў зьвярнуў увагу на тое, што ў статуце «МФ» няма дэструктыўных палажэньняў, а толькі інтарэсы нацыянальнага адраджэньня. Камэнтуючы канфіскаваныя тэкставыя матэрыялы, Галіеў зазначыў: «Нам не паставілі ў віну толькі захоўваньне ў інтэрнаце паэзіі Быкава». Пры канцы сваёй прамовы ён падкрэсьліў, што цікавасьць да гэтай справы праяўляе мноства людзей, і вынясеньне прысуду будзе сьведчыць пра дэмакратычную, нацыянальную і маральную сьпеласьць грамадзтва.

У сваім апошнім слове Кацярына Салаўёва заявіла: «Што да таго, ці прызнаю я сваю віну, то калі жаданьне адрадзіць беларускую мову, культуру, стварыць у краіне рынкавую эканоміку, жаданьне, каб у краіне праходзілі сумленныя выбары, лічыць крымінальным парушэньнем, то я сапраўды вінаватая і прызнаю сваю віну».

Ужо традыцыйна для падобных судовых працэсаў пад вокнамі праходзіла акцыя салідарнасьці. На дзіва, у Полацак не прыехаў ні менскі, ні абласны спэцназ — спраўляліся сваімі ўнутранымі рэзэрвамі. Міліцыянты затрымалі Зьмітра Хведарука, Івана Шылу і Андрэя Цянюту, пасадзілі іх у машыну, але забыліся зачыніць дзьверы, не паставіўшы аховы. Маладзёны пасьпяхова ўцяклі ад міліцыі. У пастарунак даставілі толькі Аляксея Янушэўскага, на якога склалі пратакол за ўдзел у незарэгістраванай акцыі. Пазьней хлопца судзілі, але прысуд пастанавілі вынесьці толькі ў сераду. Янушэўскі ж пасьпеў за гэты час зьехаць у Менск.

А 17.30 судзьдзя Марозава пачала выносіць прысуд. У залі зьявіліся апэратары БТ. Абвінавачаная і абарона настойвалі, каб яны пакінулі залю, але судзьдзя стала на бок «галоснасьці», пакінуўшы журналістаў. Пакараньне — 50 базавых велічыняў штрафу (1 млн 750 тыс. рублёў). Рашэньне можа быць абскарджанае цягам дзесяці дзён у Віцебскім абласным судзе.

Разам з тым, стала вядома, што супраць Салаўёвай могуць распачаць крымінальную справу за зьнявагу дзяржаўных сымбаляў. На 9 красавіка яна атрымала пазоў у полацкую міліцыю, як сьведка па гэтай справе.

Нягледзячы на перажыты суд і магчымы новы супраціў Кася Салаўёва працягвае выпраменьваць пазытыў і радаваць усіх сваёй усьмешкай. Пасьля суду, калі запытаўся ў яе пра адчуваньні, яна проста адказала: «Усё файна».

**Зьміцер Панкавец, Полацак — Менск**



А тым часам ля суду...

УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

# З дуляй у кішэні ды сініцай у руцэ

Новыя зьвесткі НІСЭПД (Літва) камэнтуе **Аляксандар Класкоўскі.**

Ведаю, што ў сьвежых табліцах Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў (зарэгістраванага ў Літве) многія найперш шукаюць рэйтынг афіцыйнага кіраўніка. Ну і што вы думаеце? За цёплую зіму гэты паказчык нават трохі падрос. А таксама заўважна дадалося тых, хто лічыць, што, па вялікім рахунку, у нашай беларускай хатачцы «парадак ідзець».

Шмат хто з апанэнтаў рэжыму меркаваў: скасаваньне льготаў, скачок інфляцыі, прэсінг супраць дробных прадпрымальнікаў падагрэюць пратэставыя настроі ды, адпаведна, падсякуць давер да вярхоў. Але ў сакавіку электаральны рэйтынг Лукашэнкі склаў 42,5% —на 2,6 пункту болей, чым у сьнежні летась.

Паболела — ад 41,2% да 50,2% — суайчыньнікаў, перакананых, што «стан рэчаў у нашай краіне разьвіваецца ў правільным кірунку» (даруйце, гэта традыцыйная дубовая фармулёўка анкеты). Увогуле з надыходам вясны, як адзначаюць сацыёлягі, дадалося сацыяльнага аптымізму. «Прайшла зіма, настала лета, дык дзякуй партыі за гэта».

Карацей, беларусы зноў праглынулі нягоды, прыцярпеліся і нават павесялелі, калі прыгрэла сонейка. Як у тым старым анэкдоце пра цьвік у крэсьле: а мо так і трэба? Ну проста ідэальная нацыя для рознага кшталту сацыяльных экспэрымэнтаў!

І вось што цікава. З аднаго боку, паспаліты люд у значнай ступені падзяляе погляды палітычнай апазыцыі ў тых ці іншых асобна ўзятых пытаньнях. Іншым разам гэтая ступень нават нечакана значная. Хто б мог падумаць: нягледзячы на шматгадовае замбаваньне, 46,4% мяркуюць, што 90-я ўгодкі БНР ёсьць «вялікай падзеяй, якую варта адзначыць», і толькі 28,6% лічаць яе нязначнай. Дадамо: апытаньне ладзілася 3—13 сакавіка, яшчэ да таго, як тэму БНР дастаткова ўзважана падалі некаторыя дзяржаўныя мэдыі.

А вось вам, наадварот, чаканая лічба: 75,9% не ўхваляюць скарачэньне льготаў. Далей: праціўнікаў пабудовы АЭС болей, чым прыхільнікаў. Львіная доля рэспандэнтаў (80,3%) перакананыя, што мэдыі мусяць выказваць інтарэсы грамадзтва, а не дзяржавы. Значнай выглядае доля прыхільнікаў таго ці іншага варыянту беларусізацыі. 51,2% упэўненыя, што на выбарах маюць месца фальсыфікацыі. Бальшыня падтрымлівае меркаваньне, што ўключэньне ў склад выбаркамаў прадстаўнікоў палітычных партый ды кандыдатаў, дазвол назіральнікам пералічваць бюлетэні, выкарыстаньне празрыстых скрыняў і г. д. — карацей, калі казаць наўпрост, рэалізацыя прапановаў АДС ды Захаду — зробіць выбары болей справядлівымі.

> Рэйтынг афіцыйнага кіраўніка трымаецца, але вырасла і колькасьць прыхільнікаў беларусізацыі і дэмакратычных каштоўнасьцяў.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Здавалася б, такая ўдзячная глеба дзеля шчыраваньня палітычнай апазыцыі! Але… Ідэю вулічнага шэсьця 25 сакавіка ўхваляе толькі траціна рэспандэнтаў. Рэйтынгі ўсіх апазыцыйных палітыкаў ніжэйшыя за 10% (Мілінкевіч — 8,8%, Казулін — 5,2%, астатнія — у межах статыстычнай памылкі). Электарат болей ахвотна прагаласуе на выбарах у парлямэнт за кіраўніка дзяржаўнага прадпрыемства ці нават цяперашняга дэпутата, чым за лідэра апазыцыйнай партыі (такі абстрактны лідэр набірае ў апытаньні толькі 11,1%). Да вулічнага пратэсту супраць фальсыфікацыі выбараў гатовыя 6,5% (гэта на словах, на практыцы не набярэцца й аднаго адсотку). У той жа час 38,4% нічога ня сталі б рабіць, а 35,6% выбралі варыянт «абавязкова распавёў бы сваім знаёмым пра фальсыфікацыю».

Карацей, стары фэномэн кухоннай апазыцыі, ці дулі ў кішэні. Прычым дулю шмат хто паказвае як уладзе, так і яе тытульным апанэнтам. З сацыялягічных табліцаў вынікае: ня тое што нашы суайчыньнікі ідэалізуюць кіроўную вярхоўку (напрыклад, ацэнкі яе эканамічнага шчыраваньня вельмі стрыманыя), але ж надта высока ставяць славутую стабільнасьць. Гары яны гарам, любыя пэртурбацыі! Беларусы па-ранейшаму аддаюць перавагу сініцы ў руцэ перад жоравам у небе.

P.S. Зыходзячы з досьведу абмеркаваньняў сацыялягічнае тэмы, адразу раблю рэмарку, што не лічу апытаньні ды камэнтары НІСЭПД нейкай апрыёрнай ісьцінай. Аднак гэта адзіная незалежная сацыялягічная інстытуцыя, якая штоквартальна дае вынікі нацыянальных апытаньняў у адкрытым доступе.

## 1 красавіка

### Пяць сутак Хамайду

Пяцьцю суткамі арышту судзьдзя Раман Дэгода пакараў актывіста КХП–БНФ і праваабаронцу **Барыса Хамайду**. 25 Сакавіка, падчас сьвяткаваньня Дня Волі, Хамайда разам з **Аленай Залескай і Антанінай Піванос** быў затрыманы ля віцебскага «сіняга дому». Жанчын пакаралі штрафам 20 і 2 базавыя велічыні адпаведна. Хамайду ж судзілі толькі 1 красавіка, бо ён запатрабаваў перакладчыка.

### Узялі тлумачэньні ў Мальчыка

Старшыня Гарадзенскай абласной арганізацыі партыі БНФ **Сяргей Мальчык** быў выкліканы ў Ленінскі РУУС Горадні адносна падзеяў 25 Сакавіка. Тлумачэньні ў Сяргея Мальчыка браў прадстаўнік аддзелу аховы грамадзкага правапарадку маёр Ленец. Старшыня абласной арганізацыі БНФ патлумачыў, што 25 сакавіка ён быў у цэнтры гораду з мэтай адзначэньня гадавіны Беларускай Народнай Рэспублікі. Пасьля гэтага Сяргея Мальчыка адпусьцілі.

### Першакрасавіцкі «жарт» зь Севярынца

Калі **Павал Севярынец** вяртаўся з суду над Андрэем Кімам, яго затрымалі каля ўваходу ў мэтро чатыры супрацоўнікі міліцыі ў цывільным. Палітыка адвезьлі ў Менскую гарадзкую пракуратуру. На яго склалі адміністрацыйны пратакол, паводле артыкулу 9.10 КаАП («Парушэньне патрабаваньня закону аб рэалізацыі права на заканадаўчую ініцыятыву»). Маецца на ўвазе збор подпісаў за зьмену ў законе аб свабодзе сумленьня. Паводле гэтага артыкулу Севярынцу можа пагражаць ад 20 да 50 базавых велічынь штрафу. Са словаў Севярынца, каб пачаць збор подпісаў, сябры ініцыятывы павінныя былі зьвярнуцца да старшыні ЦВК Лідзіі Ярмошынай. Размову з Паўлам у пракуратуры вёў маёр Юры Карніцкі.

## 2 красавіка

### На Акрэсьціна прыходзілі «кадэбісты»

Некаторых з арыштаваных за ўдзел у дэманстрацыі 25 Сакавіка моладзевых актывістаў у спэцпрыёмніку на Акрэсьціна наведвалі супрацоўнікі КДБ. Цікаўнасьць найперш праяўлялася да студэнтаў. Шантажуючы магчымым адлічэньнем з ВНУ за ўдзел у дэманстрацыі, супрацоўнікі КДБ вымушалі іх напісаць заявы аб супрацоўніцтве з органамі дзяржаўнай бясьпекі.

### БАЖ зьвярнуўся ў пракуратуру

Беларуская асацыяцыя журналістаў паўторна зьвярнулася да генэральнага пракурора Рыгора Васілевіча ў сувязі зьператрусамі, якія супрацоўнікі КДБ правялі ў кватэрах незалежных журналістаў і шэрагу офісаў 27 і 28 сакавіка. Азнаёміўшыся з тэкстамі пастановаў аб правядзеньні сьледчых надглядаў у кватэрах журналістаў і выніковых пратаколаў, журналісцкая арганізацыя выказвае сумнеў, штоператрусы мелі пад сабою законныя і дастатковыя падставы.

### Марачкін патрабуе вярнуць «Лялек»

Мастак, старшыня міжнароднага грамадзкага аб’яднаньня «Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» **Аляксей Марачкін** накіраваў ва УУС Цэнтральнага раёну Менску заяву аб вяртаньні сваіх сканфіскаваных твораў выяўленчага мастацтва — карціны «Лялькі», харугваў грамадзкага аб’яднаньня «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны», а таксама расьцяжак з рознымі тэкстамі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Маладафронтаўка Кася Галіцкая выходзіць з Акрэсьціна пасьля 10 сутак арышту за ўдзел у сьвяткаваньні 25 Сакавіка. Усяго выпусьцілі сем асуджаных. Яшчэ двое «10-сутачнікаў» — Арцём Скарабагаты і Зьміцер Курза — правялі дадатковую ноч у ізалятары, бо судзьдзя ўпісала ў пастанову дзень затрыманьня 26 сакавіка, а не 25-га.**

## 3 красавіка

### Паліну Кур’яновіч арыштавалі на 10 сутак

У Цэнтральным судзе сталіцы адбылося паседжаньне па справе затрыманай напярэдадні моладзевай актывісткі **Паліны Кур’яновіч**. Судзьдзя Тацяна Паўлючук прызнала дзяўчыну вінаватай у адміністратыўным правапарушэньні паводле арт. 23.34 КаАП («Парушэньне парадку арганізацыі і правядзеньня масавых мерапрыемстваў») і вынесла пакараньне ў выглядзе арышту на 10 сутак. Дзяўчыну затрымалі 2 красавіка каля пасольства Расеі, калі моладзевыя актывісты зьбіраліся правесьці пікет, прымеркаваны да Дня яднаньня беларускага і расейскага народаў.

### Апошняга асудзілі

Асуджаны апошні з затрыманых 25 Сакавіка ў Баранавічах грамадзкіх актывістаў. Інвалід 2-й групы па слыху **Аляксей Шчарбакоў** быў дастаўлены з пастарунку «хуткай дапамогай» у шпіталь, таму судовае паседжаньне паводле яго-най справы 26 сакавіка, калі судзілі астатніх, было адкладзенае. Судзьдзя, разгледзеўшы справу актывіста, не знайшоў ніякіх зьмякчальных абставінаў і пастанавіў спагнаць з А.Шчарбакова 5 базавых велічыняў штрафу.

### Літоўцам так і не вярнулі касэты

Ніякага адказу ад беларускага боку на патрабаваньне Літоўскага нацыянальнага тэлебачаньня (LRT) вярнуць адабраную 25 сакавіка касэту зь відэаматэрыяламі і кампэнсаваць выдаткі на рамонт зламанай падчас затрыманьня відэакамэры не было атрымана. 25 Сакавіка былі затрыманыя два журналісты LRT **Рута Рыбачаўскене і Ёніс Грышконіс**.

## 4 красавіка

### І Палажанка невыязная

Актывістку незарэгістраванага «Маладога фронту» **Насту Палажанку** зьнялі зь цягніка Менск—Варшава. На пераходзе «Варшаўскі мост» беларускія памежнікі паведамілі ёй, што яна знаходзіцца ў сьпісе невыязных, бо супраць яе распачатая крымінальная справа.

### Міліцыянты дзяжурылі каля дзьвярэй кватэры А.Бондара

А 7-й раніцы ў кватэру актывіста незарэгістраванай арганізацыі «Ініцыятыва» **Аляксея Бондара** патэлефанавалі міліцыянты. Яны патрабавалі адчыніць ім дзьверы, заяўляючы, што Аляксею трэба паехаць зь імі ў пракуратуру. Сваякі Аляксея патлумачылі, што дзьверы не адчыняць і Аляксея няма.

## 7 красавіка

### Суд над Парсюкевічам прызначаны на 16 красавіка

Пра гэта паведаміла адвакат прадпрымальніка Вера Страмкоўская. Паводле яе словаў, судзьдзём прызначаны Уладзімер Аўдзеенка. Справа актывіста прадпрымальніцкага руху была перададзена ў суд Маскоўскага раёну 31 сакавіка. **Сяргей Парсюкевіч** быў арыштаваны 4 сакавіка пасьля таго, як зьявіўся на допыт у пракуратуру Маскоўскага раёну Менску. Яму прад’явілі абвінавачаньне ў злачынстве, прадугледжаным арт. 364 КК («Гвалт або пагроза гвалту ў дачыненьні да супрацоўніка міліцыі»).

### Дапыталі яшчэ аднаго журналіста

Сьледчы ўпраўленьня КДБ па Гомельскай вобласьці Андрэй Коласаў дапытаў журналіста **Дзьмітрыя Карпенку** ў якасьці сьведкі паводле крымінальнай справы, заведзенай яшчэ ў 2005 г. па факце паклёпу на кіраўніка дзяржавы. 28 сакавіка ў кватэры Дзьмітрыя Карпенкі, як перад гэтым і ў іншых незалежных журналістаў, супрацоўнікі КДБ правялі ператрус. У яго забралі фатаграфіі, блякноты, CD з музычнымі запісамі і дыскету з курсавой работай па эканоміцы за 4 курс унівэрсытэту.

### За экскурсію — пад суд

Дзевяць гомельскіх актывістаў, якія 23 сакавіка ўзялі ўдзел у сьвяточнай экскурсіі па мясьцінах, зьвязаных зь дзяячкай БНР Палутай Бадуновай у Гомелі, будуць прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці. Яны ўжо пазнаёміліся з адміністрацыйнымі пратаколамі па справе.

### Пашкевіча выключаюць з БДУ

Моладзевага актывіста АГП адлічаюць з гістарычнага факультэту Белдзяржунівэрсытэту. Цэлы тыдзень хлопец ня можа атрымаць дазволу абараніць курсавую работу. А 7 красавіка паведамілі, што найбліжэйшымі днямі яго адлічаць. «Справа ў тым, што яшчэ летам мяне выключылі з ВНУ за ўдзел у выбарах у Менскі гарадзкі савет, за тое самае з гістфаку адлічылі і сябра Партыі БНФ Андруся Ігнатовіча. Я змог узнавіцца на завочным аддзяленьні, на 6-м курсе. Цяпер мне адмаўляюцца залічыць экзамэн па мэтадалёгіі гісторыі, які я здаў. Аднак потым высьветлілася, што здаў я не свайму выкладчыку, і экзамэн анулявалі. Не мая праблема, што ВНУ ня можа разабрацца з сваімі ўнутранымі пытаньнямі. Мне ў дэканаце адкрыта сказалі, што рашэньне аб маім выключэньні прымалася нават не на ўзроўні рэктара, а нашмат вышэй», — кажа **М.Пашкевіч**. Як лічыць хлопец, выключэньне зьвязанае з крымінальнай справай за мітынг прадпрымальнікаў 10 студзеня, удзеле ў сьвяткаваньні Дня Волі, а таксама тым, што ён стаў адным з заяўнікаў сёлетняга «Чарнобыльскага шляху».

**Зьміцер Панкавец, ЯС**

# Рэфэрэндум супраць хімзаводу

Філія расейскай фірмы «Август-Бел» пры падтрымцы дзяржаўнага кіраўніцтва зьбіраецца будаваць у Пухавіцкім раёне завод па вытворчасьці ядахімікатаў. Жыхары пасёлкаў Дружны, Сьвіслач, Рудзенск, Дукора працягваюць казаць рашучае «не».

3 красавіка ў пасёлку Дружны адбылася чарговая сустрэча прадстаўнікоў улады з насельніцтвам.

Як стала зразумела з выступу дзяржаўнага экалягічнага экспэрта, завод на аснове кампанэнтаў небеларускай вытворчасьці будзе выробляць шэсьць відаў прэпаратаў. Сп.Андрэеў расказваў пра тое, што звыклыя ўгнаеньні на нашых зямельных участках маюць трэцюю клясу небясьпекі, пра тое, што вызначыць клясу небясьпекі адкідаў ад вытворчасьці прэпаратаў можна будзе толькі тады, калі гэтыя адкіды будуць атрыманыя. Таксама, паводле яго словаў, «спальваньне адкідаў» — не зусім правільна казаць. Больш навукова — тэрмічная апрацоўка. А ўсё, што будзе заставацца пасьля тэрмічнае апрацоўкі гэтых палімэраў, будзе пакавацца і адвозіцца... на Гомельшчыну.




WWW.SVABODA.ORG

Валянціна Качан, галоўны санітарны доктар краіны, адзначыла высокі інтэлект мясцовых жыхароў. Часам здавалася, што Канстытуцыю РБ і Канвэнцыю ААН яны ведаюць ледзь не на памяць. Калі старэнькая бабулька кажа прэзыдэнту, што бабуля яна для сваіх унукаў, а для астатніх яна Лідзія Паўлаўна, гэта сьведчыць пра многае. Прынамсі, людзям хочацца, каб паважалі іх грамадзянскую пазыцыю і перасталі лічыць быдлам.

На сходзе прагучала патрабаваньне правядзеньня мясцовага рэфэрэндуму ў пытаньні будаўніцтва.

**Алена Сойка, Дружны**

## СЬЦІСЛА

### Лукашэнка: прыём Украіны і Грузіі ў NATO — пытаньне часу

Аляксандар Лукашэнка лічыць, што прыём Украіны і Грузіі ў NATO — гэта толькі пытаньне часу. «NATO замахнуўся на былыя савецкія рэспублікі. Ніхто не зьвяртае ніякай увагі на пазыцыю Расеі, Беларусі», — дадаў ён. Паводле ягоных словаў, абараняючы Беларусь, наша войска абараняе заходнія межы саюзнай дзяржавы, таму неабходна думаць аб умацаваньні абараназдольнасьці сваёй краіны.

### «Аман» (не АМОН!) забудуе тры раёны ў сэрцы Менску

25 гектараў сталічнай прасторы маюць намер забудаваць аманцы. Там, дзе цяпер станкабудаўнічы завод імя Кірава, прапанавана пабудаваць жылы комплекс. Па вуліцы Купалы, на месцы выставачнага цэнтру і 2-й бальніцы, плянуецца «дзелавая забудова з раскошнай гасьцініцай і набярэжнай». Дзяржаўны генэральны рэзэрвовы фонд Султанату «Аман» адказвае за ўрадавыя інвэстыцыі па ўсім сьвеце. За паўгоду прадстаўнікі фонду ўжо 4 разы пабывалі ў Менску.

### Пасольства ЗША ў Менску зноў прыпыніла выдачу візаў

Пасольства ЗША ў Менску зноў прыпыніла разгляд заяваў на атрыманьне візы і выдачу візаў беларускім грамадзянам. Пра гэта паведамляецца на сайце амэрыканскай дыпмісіі. «31 сакавіка ўрад Беларусі зноў прапанаваў зьменшыць колькасьць супрацоўнікаў нашага пасольства. Паколькі на мінулым тыдні штат амэрыканскіх супрацоўнікаў пасольства быў скарочаны ўдвая, мы лічым гэтае патрабаваньне беларускага боку неабгрунтаваным», — гаворыцца ў заяве.

### «Працэс 14-ці» пачнецца 16 красавіка

16 красавіка (серада) а 10.00 у судзе Цэнтральнага раёну сталіцы (вул. Кірава, 21) пачнецца судовае паседжаньне па «справе 14-ці». Пра гэта nn.by паведаміла адвакатка Андрэя Кіма Тамара Сідарэнка. М.Пашкевіч, А.Бондар, А.Баразенка, У.Сяргееў М.Субач, Т.Цішкевічі і іншыя хлопцы й дзяўчаты праходзяць па справе мітынгу прадпрымальнікаў, што адбыўся 10 студзеня ў Менску. Маладым людзям інкрымінуецца арт. 342-1 Крымінальнага кодэксу «Арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, што груба парушаюць грамадзкі парадак або актыўны ўдзел у іх». Паводле гэтага артыкулу прадугледжваецца пакараньне ад штрафу да трох гадоў пазбаўленьня волі.

**ЯС; МБ; БЕЛТА, tvr.by**

## ЦЫТАТА

### Пракаповіч: «Галоўнае — каб Эўрасаюз не далучыўся да санкцый ЗША»

На думку старшыні Нацыянальнага банку Пятра Пракаповіча, праблемаў, якія зьявіліся ў балтыйскіх філіяў «Белнафтахіму», варта было чакаць, бо «ўсе балтыйскія краіны сьвята выконваюць патрабаваньні ЗША». Старшыня Нацбанку лічыць, што зараз галоўнае — каб Эўрасаюз не далучыўся да санкцый ЗША.

**svaboda.org**

## У кабіне дальнабойшчыка выбухнуў балён

У Любускім ваяводзтве Польшчы, на мяжы зь Нямеччынай, у выніку выбуху газавага балёну ў кабіне трэйлера цяжка паранены грамадзянін Беларусі. На такіх пераносных балёнах дальнабойшчыкі вараць сабе есьці. Выбух зьнішчыў кабіну. Вадзіцель з апёкамі дастаўлены мэдычным верталётам у бальніцу.

## Агнястрэльныя дзівосы ў цэнтры сталіцы

1 красавіка невядомыя хлопец і дзяўчына спрабавалі залезьці на дах дому № 80 па пр.Незалежнасьці. Міліцыя блякавала пад'езд, але хлопец выскачыў зь дзвярэй з крыкам «Назад, буду страляць!» Уцекача затрымалі. У яго сканфіскавалі пісталет з глушыцелем і патронам у патроньніку. 27-гадовы магілёвец патлумачыў, што пісталет знайшоў і нават страляў зь яго па сьмецьцевых баках бліз плошчы Перамогі…

## У Віцебску адчынілася беларуская кавярня

Яна ў Цэнтры народных рамёстваў і мастацтваў «Задзьвіньне» (вул.Чайкоўскага, 3). У кавярні можна пакаштаваць стравы паводле старажытных рэцэптаў, у тым ліку віцебскіх.

## Мірныя будуюць спарткомплексы

Мікалай Мірны з сынам займаецца будоўляй двух спарткомплексаў у сталіцы. Першы мае адкрыцца да 2011 г. на вул.Ясеніна. Другі — крыху пазьней на вул.Чырвонаармейскай. І там, і там будзе па тры крытыя корты.

## У крэматорыях паляць сьмецьце

Зь лютага ў Беларусі дзейнічае закон «Пра абыходжаньне з адкідамі», які ўзмацніў вымогі да іх утылізацыі, каб прадпрыемствы будавалі перапрацоўчыя вытворчасьці для сьмецьця. А прадпрыемствы... пачалі зьвяртацца ў крэматорыі. Паводле Мінпрыроды, там цяпер часта паляць небясьпечныя адкіды, якія чыняць экалёгіі шкоду.

## Не Гэмінгуэй, але блізка!

Валеры і Зоя Анікейчыкі злавілі на Прыпяці пад Туравам сама вагой 38 кг, 1 мэтар 80 сантымэтраў даўжынёю. Анікейчыкі вудзілі рыбу з чаўна на тролінг, калі рыбіна ўзялася. Сом гадзіну вазіў човен па рацэ, пакуль яны далі рады яго выцягнуць.

## З наступнага году будзем тэлефанаваць, як эўрапейцы

З 2009 зь міжгародніх і міжнародных тэлефонных нумароў зьнікне звыклая «8». Беларусь далучыцца да краін, якія маюць міжнародны фармат набору. Па краіне трэба будзе набіраць «0», у замежжа — «00».

**СМ; паводле радыё «Свабода», «Салідарнасць», «Звязда», «Эўрапейскае радыё для Беларусі», БЕЛТА, «Ежедневник», «Народныя навіны Віцебску»**



На тыдні ў Менску прайшла Міжнародная выстава сабак. На фота: камандор Фаня ростам з гаспадара.

ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Вікіпэдыя і Вікіпедыя: год пасьля падзелу

Год таму адбыўся скандальны падзел Беларускай Вікіпэдыі паводле правапісу. 27 сакавіка 2007 году прыхільнікам наркамаўкі быў аддадзены дамэн be.wikipedia.org, на якім папярэдне ўжо тры гады існавала Беларуская Вікіпэдыя клясычным правапісам. У выніку энцыкляпэдыя на тарашкевіцы была перанесеная на іншы дамэн.

Беларускай Вікіпэдыі клясычным правапісам быў дадзены новы дамэн be-x-old.wikipedia.org.

Нядаўна колькасьць артыкулаў у Вікіпэдыі наркамаўкай дасягнула 10-тысячнай мяжы. Колькасьць жа артыкулаў клясычным правапісам — 9 021 артыкул. Затое ў Вікіпэдыі клясычным правапісам сярэдні памер артыкулу большы.

Усяго Wikipedia мае:

255 моўных разьдзелаў; больш за 10 мільёнаў артыкулаў; каля 34 мільёнаў старонак; больш за 464 мільёнаў дакедак; амаль 4,5 тысячы адміністратараў; больш за 11 мільёнаў зарэгістраваных карыстальнікаў; больш за 4 мільёны мэдыяфайлаў.

**Паводле: Даша Слабчанка, Generation.bY**



# Адам Глёбус у сваім блогу бароніць перабудову старога Менску

«Калі бачу руйнаваньне розных халабудаў у Беларусі, дык згадваю разбурэньне Гатычнага кварталу ў Барсэлёне, — піша ён, разьмясьціўшы фота (**уверсе**), зробленае ў Барсэлёне. — Размовы пра нейкую там адметнасьць беларускага барбарства ў адносінах да архітэктурнай спадчыны амаль заўсёды ілжывыя. І я не зьдзіўлюся, калі надыдзе час зьнесьці «хрушчобы» ды «мікрагі», як некалі зносіліся баракі, а нехта пачне іх бараніць і апяваць».

Водгукі на той запіс прыйшлі розныя.

«Што ў Беларусі адсотак старасьвецкае архітэктуры найменшы, чым дзе ў Эўропе — факт, — напісаў Сяргей Харэўскі. — І вартае ўвагі з сучаснае архітэктуры — мізэр! І калі кажуць, што Менск стане прыгажэйшым, калі зьнясем апошнія 30 дасавецкіх будынкаў — не даю веры. Няміга, напрыклад, становіцца ўсё пачварнейшай. А які адсотак у Барсэлёне застаўся старасьвецкіх дамоў? Хіба ты там адно па навабудоўлях шпацыруеш?»

**АК**

# Тату, пірсінг і кефір!

Пад чырвонае гішпанскае віно добра заводзіць лёгкую гутарку. Летась у Барсэлёне пад фужэр віна і добры настрой пазнаёміўся з парай байкераў. Разгаварыліся, жывем у адным гатэлі. Мужчынам каля пяцідзесяці, галовы выстрыжаныя паўбоксам, толькі чубчыкі натапыраныя тырчаць па панкаўскай модзе, апранутыя ў чорныя рокерскія транты, і зататуяваныя зь пят да галавы, на плячах кітайскія драконы, на руках усходнія арнамэнты, здавалася, жывога месца не засталося, спрэс — тату. Байкеры аказаліся швайцарцамі, Штэфан і Юзэф, і, да таго ж, парай геяў. Прыемныя і ветлівыя людзі, любяць падарожнічаць па Эўропе на чорных «Харлеях».

Штэфан працягнуў мне візытоўку.

«Доктар мэдыцыны, нэўрахірург». Ну, уразілі!

Юзэф патлумачыў, што Штэфан выдатны хірург і робіць складаныя апэрацыі на мозгу.

Я спытаў, ці не баяцца пацыенты, калі бачаць ягоныя тату.

— Не, так апранаюся і зашпільваюся на ўсе гузікі, што тату не відаць, — швайцарац зрабіў сур'ёзны выраз твару і паказаў, як зашпільвае каўнер і манжэткі кашулі, а потым па-дзіцячы весела зарагатаў.

— Нэўрахірург у Швайцарыі — ты мусіш добра зарабляць, — не стрымаўся я.

— На апэрацыях — ня так добра, раблю амаль задарма, а куды больш зарабляю на пірсінгу. Вось за пірсінг, сапраўды магу зарабіць на добры матацыкл і на падарожжы, —прызнаўся хірург.

Мы абмяняліся адрасамі, і вясёлыя швайцарцы пайшлі на мора купацца. На Каляды я атрымаў ад Штэфана і Юзэфа віншавальную паштоўку. Было прыемна і нечакана. Гэта было звычайнае гатэльна-курортнае знаёмства.

Я згадаў Штэфана сёньня, калі пачуў іншую менскую гісторыю.

Знаёмы скардзіцца, што сына паклалі ў лякарню, прызыўная камісія накіравала на абсьледаваньне ў Навінкі, рэспубліканскаю псыхіятрычную клініку.

— Толькі таму, што ў сына пірсінг і тату, — расказваў мужчына.

— У нас за пірсінг і тату ваенкамат адразу накіроўвае ў «дурку», і там бяда, калі трапіў у лапы нашай псыхіятрыі, то пішы прапала. У сына ў тумбачцы знайшлі пакет кефіру, я прывёз, ня ведаў, што забаронена. За кефір хлопца пакаралі, забаранілі выходзіць з аддзяленьня. Сын пачаў спрачацца, дык спачатку нечым укалолі, а цяпер ставяць дыягназ — псыхічна хворы. Вось так — быў чалавек здаровы і вясёлы, а праз завушніцу і пакет кефіру — вар'ят. І яшчэ робяць выгляд, што добрую справу робяць, ад войска адмазваюць.

Я ня ведаў, што параіць няшчаснаму чалавеку,— дактары назад ня ходзяць.

Я патэлефанаваў знаёмаму доктару і спытаў, ці так на самай справе, за завушніцу і тату ваенкамат накіроўвае ў «дурку»?

— Так, абавязкова, мы называем гэта — «паводле зьнешніх прыкметаў».

Вось такія іншародныя прыкметы ўвайшлі ў нашу псыхіятрыю. Тату, пірсінг плюс кефір і… бывай войска! Як лёгка цяпер «касіць»!

**Міраслаў Адамчык, andrej-voronin.livejournal.com**

# Вялікі дзякуй

**В.Ц.**, **Г.Ж.**, **А.Дз.**, **Вользе Ж.**, **Уладзімеру К.**, **Г.Я.**, **Генадзю Ш.**, **В.Л.**, **Канстанціну Л.**, **Яўгену І.**, **Раману М.**, **Валянціне Дз.**, **І.З.**, **Сяргею П.**, **І.Л.**, **Зінаідзе Б.**, **Віктару Л.**, **Віталю Ч.**, **Валянціне П.**, **Анатолю С.**, **Леаніду Г.**, **Анатолю К.**, **Тацяне Ф.**, **Паўлу Л.**, **Валер'ю І.**, **Віктару Д.**, **Мікалаю С.**, **Марыне З.**, **Я.А.**, **Зьмітру Б.**, **Аляксандру Л.**, **Адаму З.**, **Юр'ю К.**, **Ф.С.**, **Г.П.**, **Сяргею А.**, **Уладзімеру Р.**, **Веры С.**, **Сьвятлане Ш.**, **Ніне Ш.**, **Сьвятлане Р.**, **Эле С.**, **Сьвятлане К.**, **Рэгіне Б.**, **Тацяне К.**, **Натальлі М.**, **Міхаілу К.**, **Васілю З.**, **Э.К.**, **Сяргею Г.**, **Але Х.**, **Ільясу Х.**, **Т.С.**, **Пятру Б.**, **В.Ш.**, **Н.Б.**, **Багуславу Я.**, **Валянціне Ш.**, **В.Н.**, **А.Р.**, **Натальлі А.**, **Алене Д.**, **Вячаславу К.**, **Вользе Ш.**, **Н.Ш.**, **Андрэю Б.**, **Уладзімеру Г.**, **Уладзімеру К.**, **Уладзімеру Ц.**, **Іне К.**, **Аляксандру С.**, **Сяргею Г.**,

Дзякуй за падтрымку **Міхасю Баяроўскаму** зь Бірмінгему (Вялікая Брытанія).

**Радзіму Г.**, **Генадзю Ц.**, **Генадзю Р.**, **Мікалаю К.**, **Алесю Дз.**, **Вользе А.**, **Але С.**, **Ігару Х.**, **Уладзімеру З.**, **Р.Б.**, **Андрэю С.**, **Ігару С.**, **Н.А.**, **Аляксандру Л.**, **Кастусю Ж.**, **Алене В.**, **Паўлу Н.**, **Аляксею П.**, **Андрэю Ф.**, **Леаніле Г.**, **Анатолю П.**, **Міхаілу Л.**, **Ю.В.**, **Ігару Д.**, **В.В.**, **В.К.**, **Алене Л.**, **А.Л.**, **В.Б.**, **Мікалаю Ш.**, **Аляксандру Б.**, **Міхаілу Ж.**, **М.П.**, **Валер'ю Ш.**, **Натальлі М.**, **Ірыне Ц.**, **Т.П.**, **Натальлі Д.**, **Зьмітру Р.**, **У.Л.**, **Тацяне Ц.**, **А.А.**, **Казімеру Г.**, **Уладзімеру М.**, **Аляксандру П.**, **Г.С.**, **Станіславу Р.**, **Анатолю А.**, **Алегу Т.**, **І.С.**, **Тацяне Я.**, **Сяргею Г.**, **Алене С.**, **А.С.**, **Зьмітру М.**, **Д.**, **П.Л.**, **Тацяне Б.**, **Паўлу Е.**, **Георгію Ш.**, **Тамары К.**, **Л.П.**, **Сяргею У.**, **Марыі П.**, **Аляксандру С.**, **У.М.**, **Раісе М.**, **Г.С.**, **В.Л.**, **Альбэрту С.**, **Мікалаю Л.**, **Тэрэсе Р.**, **А.К.**, **Яўгену Л.**, **Уладзімеру Ш.**, **Вандзе К.**, **П.Д.**, **Аляксандру Ф.**, **А.К.**, **Сьвятлане Р.**, **Але П.**, **Яўгену П.**, **В.К.**, **Аляксандру Д.**, **Ігару Б.**, **Натальлі І.**, **Тамары Т.**, **Юр'ю Л.**, **Алене Л.** зь Менску.

**Франц Сіўко. Дзень Бубна.** — Менск: Логвінаў, 2008. — 276 с.

Замаўляйце кнігі сэрыі

«Кнігарня «Наша Ніва»

праз т.:
**(029) 505-39-11,**
**(029) 126-36-87**

або праз e-mail:
**knihi@me.by**




ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

## Пра візавыя санкцыі Эўрасаюзу

Нават сымбалічны крок у выглядзе забароны на ўезд ставіць асобаў, супраць якіх скіраваныя санкцыі, у адзін шэраг з кантрабандыстамі, дробнымі крымінальнікамі і прастытуткамі, якіх таксама не пушчаюць у ЭС.

**С**

* * *

Адно тое, што сытуацыя ў Беларусі ізноў будзе абмяркоўвацца, адштурхне многіх інвэстараў, якія гатовыя працаваць з рэжымам. Вялікія грошы ня любяць нечаканасьцяў.

**Вітаўт**

## Нацыянальная архітэктура

**Урад вырашыў ня зносіць хрушчоўкі, а рэканструяваць. Піша Сяргей Харэўскі («НН» № 13'2008).**

Жыцьцё разрулiць. Нешта адрамантуецца, нешта перабудуецца. Хрушчоўкі апынуліся цяпер у цэнтры — дарагое месца кожнага гораду. Павялічыцца дабрабыт — іх заменяць. Адносна нацыянальнай архітэктуры: канечне, частка яе — гэта хрушчоўкі, а дзе дзецца? Не перасяляць жа жыхароў Берасьця ў драўляныя дамкі нацыянальнай архітэктуры, кшталтам адкапаных археолягамі на старым горадзе!

**Я нарадзіўся ў хрушчоўцы**

* * *

У Бэрліне (той частцы, што была пад саветамі) пустуе вялікая колькасьць савецкіх шматпавярховак. Жыць там ніхто не жадае. Рэканструяваць дорага. Час ад часу руйнуюць ды будуюць новыя. Пяціпавярховікі там часта рэканструююць. Па-першае, да ўсіх іх прыбудоўваюць ліфты. Па-другое, ніякіх мансардаў там ня робяць. А на дахах робяць нешта не ўяўляльнае для савецкага чалавека: тамака растуць дрэвы (кустарнікі), стаяць шэзьлёнгі, нават басэйны! Між іншага, яны там усе памяшаныя на экалёгіі. Увогуле больш багатыя купляюць дамы за горадам, а ў горадзе жыве ўжо народ прасьцейшы. Той, хто жыве ў такіх перабробленых савецкіх дамох на першым паверсе, гэта проста шчасьлiўцы, бо ў іх абавязкова будзе свой зялёны кавалачак зямлі ля дому, гэткі садок, дзе можна пасядзець і адпачыць. Натуральна, што выхад з кватэры ў іх ужо зроблены не на лесьвічную клетку, а адразу на вуліцу ў гэты садок... Працягваць можна бясконца...

**Лёкса, Салігорск**

## Кранальная нармальнасьць быцьця

**Польскі крытык і перакладчыца Малгажата Бухалік пра раман Бабінай «Рыбін горад» («НН» № 13'2008).**

«Рыбін горад» — найлепшае, што я сустрэў у беллітаратуры за апошнія 10 год. Раю!

**БК, Барысаў**

* * *

Гэты раман — зьява вельмі неардынарная для сучаснай беларускай літаратуры. Ён чытаецца на адным дыханьні. Якасны сучасны беларускі прадукт.

**Mikalaj**

## Яшчэ адна дыктатура захісталася

**...зымбабвійскі ЦВК устрымліваецца ад абвяшчэньня вынікаў прэзыдэнцкіх і парлямэнцкіх выбараў («НН» № 13'2008).**

Цяпер 100 даляраў — гэта 20 кг зымбабвійскіх грошай. Вось крах яшчэ адной дыктатуры. На чарзе Чавэс і...

**chiefoldsun**

## Чаргінец пра «сацыяльна значную літаратуру»

**Паводле Чаргніца, «група людзей, што нэгатыўна ставяцца да дзяржавы і ўлады, прапанавала ўнесьці ў пералік сацыяльна значнай літаратуры... фашысцкага прыхвасьня Арсеньневу» («НН» № 13'2008).**

С чем никак не могу согласиться — так это с попытками поставить знак равенства между советским режимом и оккупационным фашистским. Извините меня, но разница есть. И дело, разумеется, не в том, что первый — «истинно народный». Я думаю, что если завтра война — все мы пойдем защищать Родину под нелюбимыми красно-зелеными флагами нелюбимой власти. А если вы хотите сказать, что не пойдете, а будете дожидаться, пока придет оккупационная власть и может быть разрешит вам печататься на последней странице их новой газеты — то извините, нам с вами не по пути.

Да, Арсеньева не писала стихов, прославляющих фашистов, но по мне — так видеть «Магутны Божа» на страницах оккупационных газет даже противнее и больнее, чем фашистскую пропаганду...

**Константин**

* * *

«Магутны Божа» быў напісаны ў 1943 г., але першы раз апублікаваны ў 1947 г., ужо ў лягерах паваеннай Нямеччыны. Ня факт, што і Равенскі паклаў яго на музыку ў 1943 г., бо жыў падчас вайны ў Чэрвені.

**Бяз подпісу: (адказ Канстанціну)**

* * *

Знайдзіце у Н.А. хоць адзін ухвальны верш пра Гітлера. Я пакуль што не знайшоў. А вось перад вайной, перад тым, як яе саслалі ў Казахстан, Н. А. пісала: «Люблю цябе, Сталін, і я невымоўна». Але гэта яе не ўратавала. На чарзе быў даўні віленскі знаёмец Н.А. і яе калега па вялейскай абласной газэце, але таго ўратавалі камсамольская маладосьць за польскім часам і... вайна. Пасьля вайны былы першы сакратар Вялейскага абкаму КП(б)Б Іван Клімаў казаў: Эх, не дабраўся я да гэтага цыбатага!.. Цыбаты — Максім Танк. Дык вось, ад Яўгена Іванавіча я ніколі ня чуў словаў асуду на адрас Н.А. І ад удзельніка партызанскага параду 1944 г. Янкі Брыля, які, дарэчы, пазнаёміўся з Н.А., Рыгорам Крушынам, Ант.Адамовічам ды іншымі ў акупаваным Менску і друкаваўся ў той самай Бел.газэце. Таленавітыя пісьменьнікі, Танк і Брыль паважалі талент Н.А. Зьняважыць яе мог толькі непісьменьнік.

Кнут Гамсун быў ПАЛІТЫЧНЫМ прыхільнікам Гітлера. І што? Пераклады ягоных твораў друкаваліся пры савецкай уладзе.

Палітыка і мастацтва — гэта розныя сфэры. Н.А. была мастачкаю. А яе палітыка заключалася ў любові да Беларусі і ў тым, каб захаваць дзяцей. І ўсё ж адзін яе сын, Яраслаў, загінуў у гарадзкім (цяпер Купалаўскім) тэатры ад бомбы, якую для Кубэ падклалі людзі фон Готбэрга. Кубэ сышоў да выбуху. А сын Арсеньневай загінуў.

**Анатоль Сідарэвіч**

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

## Камуністы выйгралі ў міні-футбол

Актыўная грамадзкасьць Берасьцейшчыны здолела давесьці міні-футбольны турнір на кубак Незалежнасьці. Да фіналу дабраліся чатыры каманды зь сямі: «Маладая Грамада» БСДП, «Новыя магчымасьці» ПКБ, «Чорная зорка» руху анархістаў й «Пагоня» ПБНФ.

Каля пляцоўкі лунала нацыянальная сымболіка.

У выніку каманда ПБНФ «Пагоня» — трэцяе месца, «Чорная зорка» — другое месца, ПКБ «Новыя магчымасьці» — першае.

**Яўген Скрабец, Берасьце**

## Пэнсіянэру музэй задарагі

Мінчанін-пэнсіянэр, сядзі ў хаце і ня рыпайся! Што ўжо на лецішча ня можаш лішні раз паехаць, каб дыхнуць сьвежым паветрам (білет каштуе ўдвая), то прывыклі за паўгоду. Але і ў музэй табе няма чаго поўзаць, бо ён таксама падаражэў (выключэньне — Палац мастацтваў, дзе паказваюць марцовых катоў са ўсяго сьвету). Глядзі сабе сэрыялы ці блёкбастэры і ня лазь па горадзе. І які гэта інтэлектуальны пэнсіянэр паедзе ў музэй Нацыянальны, напрыклад, зь Зялёнага Лугу? Інтэлігентны пэнсіянэр яшчэ ж і пэнсію мае малую. І хай той Рыгор Сітніца не сярдуе на зямлячку, што не пайшлі на ягоную выставу і не паказалі яе ўнукам. А хто яшчэ іх павядзе туды? Са школкі лепш заплянуюць фігуры з воску ці яшчэ якуюнебудзь культуру «рор».

А замежнікі хіба здурэўшы пойдуць глядзець строй якой-небудзь княгіні за такую цану, калі ўжо бачылі і Люўр і Дрэздэн.

А ахова ў музэях! У Белым Доме (ЗША) і то так не шманаюць наведнікаў. Божа мілы, ратуй Беларусь! А памылак у перакладах на ангельскую! Брыдка, аж вушы гараць!

**Пэнсіянэрка, якая бачыла паўсьвету і захацелася набрацца культуры яшчэ ў родных музэях. Зваць Алеся. Прозьвішча маю, але не хачу падаваць, бо яшчэ працую. Так што я яшчэ квіткі змагла купіць сабе і сваім унукам**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

«НН» распачынае сэрыю гутарак з палітыкамі. Да першага журналісты «НН» выправіліся да Анатоля Лябедзькі, які рыхтуецца да зьезду Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

# Чалавечае і палітычнае: Лябедзька



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

### «Катастрофы не адбылося»

**«Наша Ніва»: Пасьля таго, як сталі першым палітычным невязным з краіны, дома бываеце часьцей?**

**Анатоль Лябедзька:** Натуральна. Нічога катастрафічнага не адбылося. Цяпер болей часу для паездак па рэгіёнах. Раней штомесяц былі адна—дзьве паездкі за мяжу, цяпер вось магу правесьці гэты час дома. На днях атрымаў ліст з Генэральнай пракуратуры. Я канкрэтна фармуляваў пытаньні, але фактычна ні на адно не атрымаў канкрэтнага адказу. Ёсьць юрыдычныя прычыны абмяжоўваць мой выезд з краіны, яны імі кіруюцца. Улады нават запозна зрабілі мяне невыязным. Я ўжо рэалізаваў сябе ў міжнароднай дзейнасьці.

Мяркую, што ўлады вяртаюцца да старой савецкай практыкі, калі на Варшаўскім мосьце мянялі дысыдэнтаў, а цяпер права на выезд апазыцыянэраў будуць паштучна мяняць на права выезду для чыноўнікаў. Лукашэнка за ўсю сваю кар'еру не дасягне такога ўзроўню сустрэч, якія былі ў мяне і маіх калег. Даводзілася сустракацца з Колем, Бэрлюсконі, Гаўлам, Юшчанкам і інш.

**«НН»: А што яшчэ запамінаецца найбольш падчас міжнародных паездак?**

**АЛ:** Вядома, людзі. У 1997 годзе на Парлямэнцкай асамблеі АБСЭ быў выступ па Беларусі, у залі было паўтысячы чалавек, усе яны стоячы віталі нашу дэлегацыю. Пасьля да мяне падышоў сталы чалавек, які літаральна стаў на калені і сказаў: «Я схіляю галаву перад мужнымі людзьмі Беларусі». Потым высьветлілася, што гэта брытанскі дэпутат Мантгомэры. Такое запамінаецца надоўга. Бывалі і сьмешныя моманты. Кожны ведае славуты выраз Жырыноўскага «Беларусь выратуе толькі снайпэр», але мала хто ведае, дзе гэта было сказана. 1997 год, Капэнгаген. Нісьцюк тады паўжартам запытаўся: «Уладзімер Вольфавіч, як Вы можаце падтрымліваць Лукашэнку?». Жырыноўскі абярнуўся і сказаў: «Я — ніколі. Беларускую праблему вырашыць толькі снайпэр». Такіх гісторый можна ўспамінаць шмат.

> Мілінкевіч і Казулін маюць пэўныя прэфэрэнцыі на лідэрства. У першага напрацаваная вялікая вядомасьць, у другога – самаахвярнасьць. Яны цяпер наперадзе, але гэта ня значыць, што на фінішы іх ніхто не абгоніць.

### «Пакуль ёсьць толькі мая кандыдатура»

**«НН»: У канцы красавіка пройдзе чарговы зьезд АГП. Якія ў Вас чаканьні адносна яго?**

**АЛ:** Мы рыхтуем праекты двух важных дакумэнтаў. Першы — пасланьне АГП да грамадзян Беларусі. Проста ў красавіку з сваім пасланьнем зьвяртаецца і Лукашэнка. Мы лічым важным, каб было два погляды на праблемы і іх рэалізацыю. Другі дакумэнт — стратэгія партыі да 2011 г. Безумоўна, будзе разглядацца пытаньне новага кіраўніцтва.

У нас ужо абазначыўся працэс партыйнага абнаўленьня. У Менску, Менскай вобласьці і Віцебскай да кіраўніцтва структур АГП прыйшлі новыя

Працяг на старонцы 20.

# Чалавечае і палітычнае: Лябедзька

**Працяг са старонкі 19.**

людзі, маладыя. Я б нават сказаў, што яны болей мэнэджары, чым палітыкі.

Што да старшынства ў партыі, то на сёньня ёсьць толькі мая кандыдатура. Тут ёсьць і плюсы, і мінусы. Асабіста мяне больш задавальняе, калі ёсьць канкурэнцыя, бо яна прымушае людзей прыўносіць у партыю нейкую новую дынаміку, ідэі. Можа, на зьезьдзе зьявяцца іншыя кандыдатуры.

**«НН»: А калі не сакрэт, што новага чакаецца ў стратэгіі АГП на бліжэйшыя гады?**

**АЛ:** У 2003 г. мы былі ці не галоўнымі ініцыятарамі аб’яднаньня ўсіх дэмакратычных сіл. Цяпер ізноў ідуць размовы, што павінны быць створаныя правыя, левыя, цэнтрысцкія кааліцыі. Я катэгарычна супраць гэтага. Мы розныя, у нас ёсьць свае праграмы і сьветапогляды, але ўсе мы знаходзімся ў адной жалезнай клетцы. У стратэгіі, канечне, будзем адстойваць тое, каб у 2011 г. мы выйшлі з адзіным кандыдатам.

**«НН»: А сама АГП не зьбіраецца на зьезьдзе вылучаць свайго кандыдата ў прэзыдэнты?**

**АЛ:** Такі пункт можа прысутнічаць, але ён ня будзе галоўным. Галоўнай будзе працэдура, якую мы прапануем для вылучэньня адзінага. Што да майго ўдзелу ў выбарах, то я не хацеў бы забягаць так далёка. Выпрацоўка працэдуры абраньня пакуль важней, чым асабістыя амбіцыі. Мы прапаноўваем правесьці шырокія «праймэрыз» выбарцаў. Кангрэс — гэта толькі частка людзей з дэмакратычнымі перакананьнямі. Наша задача прапанаваць такую працэдуру, якая ў вызначэньні адзінага закране як можна больш людзей. У Баўгарыі некалі ў падобных «праймэрыз» узялі ўдзел каля 600 тысяч чалавек. Легітымнасьць такога кандыдата была б значна большай.

Я зь сям’і людзей, сквапных да працы. У майго бацькі заўсёды было больш зямлі, чым трэба. Ён выяжджаў у лес, дзе раскарчоўваў дзялянкі, і радаваўся як дзіця, калі старшыня калгасу зь пяці дзялянак знаходзіў толькі дзьве.

## «Вынік перадусім, а ўжо потым крыўды»

**«НН»: У 2005 годзе было крыўдна не дабраць некалькіх галасоў, каб стаць адзіным кандыдатам?**

**АЛ:** Канечне, эмоцыі прысутнічалі. Мы ж усе жывыя людзі. Унутры АГП сытуацыя была вельмі хісткай, большая частка людзей нават адмаўлялася ўдзельнічаць у той кампаніі. Я быў вымушаны паставіць умову: альбо я сыходжу з кіраўніцтва партыі, альбо мы выконваем нашы абавязкі. Большасьць людзей працавала ў штабе адзінага кандыдата, але былі і тыя, хто застаўся збоку. Мы палітыкі, таму павінныя разумець, што вынік перадусім, а ўжо потым розныя крыўды.

**«НН»: Якія сёньня Вам бачацца галоўныя памылкі прэзыдэнцкай кампаніі 2006 году?**

**АЛ:** Мы занадта позна сфармулявалі выразную пазыцыю адносна вуліцы. Для часткі лідэраў, ня будзем высьвятляць каго, галоўным было, як перажыць 19 сакавіка, а ня што рабіць у гэты дзень. Я разумею, што ў людзей ёсьць родныя, блізкія, але ўсім нам не хапіла мужнасьці. Мілінкевіч выйшаў з кампаніі з пэўным палітычным капіталам, але ён ня лепшым чынам ім распарадзіўся ўжо пасьля выбараў. Яму самому трэба было ініцыяваць правядзеньне Кангрэсу, каб зрабіць справаздачу і прапанаваць новыя пагадненьні, але ягоныя дарадцы параілі іншы варыянт. Мілінкевіч і Казулін маюць пэўныя прэфэрэнцыі на лідэрства. У першага напрацаваная вялікая вядомасьць, у другога — самаахвярнасьць. Яны цяпер наперадзе, але гэта ня значыць, што на фінішы іх ніхто не абгоніць.

## «Я бяру гэтую акругу і адказны за яе»

**«НН»: На парлямэнцкіх выбарах спадзяецеся перамагчы на сваім участку?**

**АЛ:** Калі будзе сапраўдны падлік галасоў, то я не магу не перамагчы. Нават чатыры гады таму, калі я ўдзельнічаў у такой самай кампаніі, ёсьць вынікі сацыёлягаў, што я атрымаў 60% галасоў. За гэты час сытуацыя для мяне і іншых дэмакратычных кандыдатаў толькі палепшала. Ёсьць пратэстныя настроі сярод тых, у каго адабралі льготы, сярод прадпрымальнікаў, настаўнікаў. Разам з тым, я сам ініцыяваў рашэньне аб абмежаваным удзеле ў выбарах. Мы павінныя пакінуць за сабой права на апошнім этапе зьняць усіх сваіх кандыдатаў. Нам непатрэбны байкот, бо байкот актывістамі часта ўспрымаецца так — ляжаць на канапе і нічога не рабіць. Я сам удзельнічаў у байкоце і ведаю, што зусім нямногія ўспрымаюць яго як цяжкую працу. Мы будзем браць удзел ва ўсіх этапах выбарчай кампаніі, бо важна данесьці сваё меркаваньне да выбарцаў. Выкарыстаць выбарчую кампанію, каб мабілізаваць людзей да выхаду на вуліцу. Я прапанаваў усім нашым лідэрам узяць акругу ў Менску і папрацаваць звычайным палявым каман-

дзірам. У любым выпадку ўсе падзеі будуць разгортвацца ў сталіцы, таму важна, каб 20 чалавек з амбіцыямі агульнанацыянальнага лідэра, сказалі: «Я бяру гэтую акругу і адказны за яе». Пры ўсёй павазе да пэўных маладых людзей, якія будуць балятавацца ў Менску, ім правесьці такую мабілізацыйную кампанію значна цяжэй, чым Мілінкевічу, Шушкевічу, Статкевічу, Баршчэўскаму, Лябедзьку.

### «У адной руцэ трымаў клюшку, у другой — мыліцы»

**«НН»: Сп.Анатоль, адкуль у Вас такі баявы характар, які часта праяўляецца на мітынгах?**

**АЛ:** У дзяцінстве досыць часта біўся падчас нейкіх футбольных ці хакейных баталій. Памятаю, некалі пацягнуў жыльле, хадзіў на мыліцах, але ўсё адно прыйшоў на хакей. Мяне паставілі на вароты. У адной руцэ трымаў клюшку, у другой — мыліцы. Відаць, падчас гэтых спартовых спаборніцтваў і выпрацаваўся характар змагацца да канца. Я і цяпер кожную суботу гуляю ў футбол зь сябрамі палітыкамі, журналістамі, з самымі рознымі людзьмі.

**«НН»: Да бацькоў у Трылес [вёска за Стоўпцамі] часта езьдзіце?**

**АЛ:** Трэ было б часьцей, але не заўсёды ўдаецца. Бацька мой усё жыцьцё працаваў на зямлі. Ён з пароды тых, каго ў 1930-я раскулачвалі. Чалавек фантастычна працавіты і сквапны да працу. У яго заўсёды было больш зямлі, чым трэба. Ён выязджаў у лес, дзе раскарчоўваў дзялянкі, і радаваўся як дзіця, калі старшыня калгасу зь пяці дзялянак знаходзіў толькі дзьве. Яму ўжо 70 гадоў, а ўсё яшчэ працягвае трымаць вялікую гаспадарку, бо ня можа інакш. У маці маёй адзіны боль — калі я ўжо скончу займацца палітыкай, яна вельмі веруючы чалавек. Бацькі слухаюць радыё «Свабода».

**«НН»: Бульбу саджаць дапамагаеце?**

**АЛ:** Калі Лукашэнка кажа, што апазыцыя вырасла на асфальце, то гэта поўная бязглузьдзіца. Я сам чатыры гады адпрацаваў на жніве. Дзякуй Богу, што бульбы меней цяпер сталі саджаць. Раней цэлы гектар засявалі, што памерці можна было, пакуль выкапаеш.

Мой пляменьнік некалі з дурніцы хацеў пайсьці працаваць у міліцыю, калі высьветлілі прозьвішча, то ніхто ня ўзяў. У мяне быў досыць страшны выпадак, калі загінуў родны дзядзька. Так здарылася, што я ня змог прыехаць на пахаваньне, бо адзін зь сямейнікаў займае вельмі высокую пасаду. Гэта сапраўдная трагедыя.

**«НН»: А наадварот, прозьвішча дапамагала некалі?**

**АЛ:** Вось вымушаны цяпер аддаць машыну ў рамонт, дык у грамадзкім транспарце падыходзяць людзі, вітаюцца. Яны надаюць пазытыву.

Лічу, што ў 1994 годзе адбылася беларуская Аранжавая рэвалюцыя.

### «Мне пашанцавала, што сям'я мяне разумее»

**«НН»: Як ставіцца сям'я да пастаянных арыштаў?**

**АЛ:** Нядаўна палічыў, што ўжо сем разоў быў на Акрэсьціна. Мне пашанцавала, што бацька, жонка, сын — усе мяне разумеюць.

Я ведаю людзей у палітыцы, у якіх, калі яны прыходзілі дадому, адкрываўся новы фронт. Яшчэ больш цяжкі, бо гэта родныя людзі. Хаця раз-пораз і жонка кажа, каб кідаў палітыку, ня кажучы пра маці.

Толькі бацька заўсёды на маім баку, бо лічыць, што нехта ж гэта павінен рабіць.

Сын ходзіць са мной на ўсе акцыі, але ў яго няма вялікай цягі да палітыкі. Сёлета ён канчае вучобу, пытаньне працаўладкаваньня стаіць досыць востра. Калі чуюць прозьвішча Лябедзька, то ўсе адмаўляюцца.

### «Лукашэнка прапанаваў мне ўзначаліць мытны камітэт»

**«НН»: Час ад часу Вас усё яшчэ папікаюць тым, што ў 1994 годзе былі ў камандзе Лукашэнкі. Ставіцеся да гэтага спакойна?**

**АЛ:** Ёсьць такое. На мяне сёньняшняга часта глядзяць праз прызму таго часу. Кажуць, ён зрабіў Лукашэнку прэзыдэнтам. Каб гэта было так лёгка, то я б ужо нарабіў дзясятак дэмакратычных прэзыдэнтаў. Ворагам тады быў не Лукашэнка, пагроза сыходзіла ад Кебіча. Была рэальная пагроза сувэрэнітэту, Кебіч вёў сябе як савецкі сакратар, які браў чамадан «Белавескай» і ехаў вырашаць пытаньні. Гэта прывяло да таго, што частка дэмакратаў падтрымала Лукашэнку. Лічу, што ў 1994 годзе адбылася беларуская Аранжавая рэвалюцыя. Я спакойны, бо ведаю, што ніколі не гандляваў сваімі поглядамі.

**«НН»: А як потым разьвіваліся Вашы з Лукашэнкам стасункі? Можа, прапаноўвалася нейкая пасада?**

**АЛ:** Прапановы былі насамрэч. Многія лічаць, што мне прапаноўвалі і Міністэрства замежных справаў, і Міністэрства адукацыі, але гэта няпраўда. Калі ўжо называць рэчы сваімі імёнамі, то мне прапаноўвалася ўзначаліць прэзыдэнцкі савет. Мне было насамрэч цікава, бо задумваўся орган як пасярэднік між грамадзянскай супольнасьцю і уладай. Але я ня бачыў палажэньня гэтага савету, узьнікла паўза. Пасьля былі белыя плямы ў газэтах і г.д. Да лета 1995 году ў нас не было з Лукашэнкам ніякіх камунікацый. Была ідэя правядзеньня круглага стала між уладай і прадстаўнікамі грамадзкасьці. Я размаўляў з Лукашэнкам амаль паўтары гадзіны. Ён казаў: «Анатоль, дарэмна ты сышоў. Давай паезьдзім разам па рэгіёнах, паглядзі, як да мяне ставяцца людзі. Вазьмі канкрэтную справу». Ён прапанаваў мне ўзначаліць мытны камітэт. Я сказаў, што мяне задавальняе статус дэпутата Вярхоўнага Савету. Тады бяры віцэ-прэм'ера ў сацыяльных пытаньнях, кажа Лукашэнка. Я зноў адмовіўся. Пасьля гэтага мы зь ім не кантактавалі.

**«НН»: Напісаць мэмуары ня хочаце? Мо ўжо пішуцца паціху?**

**АЛ:** Не, не пішу, бо няма часу. Я ўсё ж практыкуючы палітык. Калі ёсьць вольны час, то бяру маладых людзей і ежджу раскідаць у паштовыя скрынкі газэты.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

# Ігар Ліхавы: «Ніхто за нас нашую працу ня выканае»

З паслом Украіны ў Беларусі гутарыць **Наталка Бабіна**.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Наталка Бабіна: Спадар пасол, словазлучэньне «ўкраінская дыпляматыя» выклікае ў мяне, чалавека, далёкага ад гэтай дзейнасьці, асацыяцыю са знакамітай карцінай «Запарожцы пішуць ліст турэцкаму султану». А што такое насамрэч праца дыплямата? Ці цяжка Вам прадстаўляць Украіну ў Беларусі?**

**Ігар Ліхавы**: Для мяне праца ў Беларусі — першая дыпляматычная місія. Шмат адкрыцьцяў, шмат чаму вучуся. Беларусь — адна зь першых дзяржаваў, зь якой Украіна ўсталявала паўнавартасныя дыпляматычныя стасункі. Плён гэтых дачыненьняў вялікі: таваразварот паміж нашымі дзяржавамі большы за 3 мільярды даляраў, што трымае Ўкраіну на трэцім месцы сярод гандлёвых партнэраў Беларусі, прычым таваразварот вельмі збалянсаваны, імпарт і экспарт амаль роўныя.

**НБ: Я ведаю, што паводле адукацыі Вы — інжынэр-электрык, доўгі час узначальвалі Нацыянальны запаведнік Тараса Шаўчэнкі, працавалі міністрам культуры і турызму. Як інжынэра-электрыка наагул «занесла» ў бок культуры, а пасьля дыпляматыі?**

**ІЛ** (сьмеючыся): О'Генры сьцьвярджаў, што менавіта дарогі нас выбіраюць, а ня мы іх. Выбар прафэсіі — ён жа не на ўсё жыцьцё. Калі я яе выбіраў — яна была мне цікавая. Я вучыўся ў адным з найлепшых ВНУ Ўкраіны — Адэскім політэхнічным інстытуце, мне падабалася мая спэцыяльнасьць, на трэцім курсе я, адзін з 12 тысяч студэнтаў, якія тады там навучаліся, нават зрабіў вынаходніцтва.

**НБ: А чаго яно датычылася?**

**ІЛ:** Ой, гэта складана!

**НБ: Нічога, паспрабуем зразумець.**

**ІЛ:** Яно датычылася статара трохфазнага электрычнага рухавіка. Гэта вельмі высокай якасьці рухавік, і нешта новае дадаць да яго тады ўжо было складана. Тым ня менш, мне гэта ўдалося, і вынаходніцтва было выкарыстанае пры вытворчасьці мільёнаў рухавікоў. Прэмію мне заплацілі — аж 40 рублёў... А далей я пяць гадоў працаваў на вялікім радыёзаводзе — «паштовай скрыні». На гэтым заводзе ўсё было пад асаблівым кантролем і не было чуваць украінскай мовы. Гаварыць па-ўкраінску, выяўляць сваю ўкраінскасьць можна было толькі за яго межамі. А потым — у гады перабудовы — аказалася, што час патрабуе людзей з новымі поглядамі, якія, між іншага, гавораць па-ўкраінску і свае жыцьцёвыя каштоўнасьці не супрацьпастаўляюць агульнаэўрапейскім.

Ва Ўкраіне праходзяць шматлюдныя мітынгі, часта несанкцыянаваныя, але ні разу не было сутычак, нікога не арыштоўваюць і не штрафуюць.

**НБ: А Вашая дасканалая ўкраінская — зь дзяцінства, зь сям'і?**

**ІЛ:** Так, зь сям'і. Я з Жытоміршчыны. Мой бацька быў вясковым настаўнікам, мама — мэдсястрой. Мова, нацыянальная самаідэнтыфікацыя — ад іх. Дык вось, у тыя часы я перайшоў з заводу ў гаркам партыі, потым працаваў намесьнікам старшыні гарвыканкаму. Гэта была страшна цяжкая праца! Маса праблемаў гарадзкой гаспадаркі, маса праблемаў зь перасяленцамі Чарнобылю, воінамі-аўганцамі — але гэта добра загартавала. Празь нейкі час мяняўся кіраўнік у Дзяржаўным запаведніку Тараса Шаўчэнкі, і калектыў яго зьвярнуўся да мяне. Пагадзіўся я не адразу, бо Шаўчэнка з самага дзяцінства многа для мяне значыў, і ня быў упэўнены, што змагу належным чынам адпавядаць гэтай рабоце. Гэты запаведнік, дарэчы, быў першым ва Ўкраіне, створаным яшчэ Сымонам Пятлюрам 90 год таму. Там я прапрацаваў 16 год... Калі Юшчанка выйграў выбары, ён прапанаваў мне пасаду міністра культуры і турызму, а ўжо адтуль я перайшоў на дыпляматычную працу.

## Параўноўваючы Ўкраіну і Беларусь

**НБ: У якасьці пасла, параўнайце жыцьцё людзей ва Ўкраіне і Беларусі.**

**ІЛ:** Думаю, такія параўнаньні можна і трэба рабіць — мы ж суседзі. Але трэба

ўлічваць шлях, які выбрала Украіна. Ён адрозьніваецца ад шляху Беларусі.

**НБ: А Вы лічыце, што Беларусь выбрала свой шлях?**

**ІЛ:** Заўвага слушная. Насамрэч, і мы, і вы ў дарозе, у пошуку. Калі нашы дзяржавы стварыліся ў 1991 годзе, усе месцы геапалітычныя былі ўжо занятыя. Тады ў нас былі вельмі падобныя сытуацыі. Нават абвяшчэньне незалежнасьці ў 1991 годзе адбылося празь дзень: ва Ўкраіне — 24 жніўня, у Беларусі — 25 жніўня. Але калі ва Ўкраіне гэтую дату памятаюць і адзначаюць як вялікае сьвята, то ў Беларусі, як ні дзіўна, пра яе амаль не ўспамінаюць. Гэта таксама паказчык.

Рынкавыя адносіны ва Ўкраіне больш разьвітыя.

За гэты час нашыя дзяржавы і народы прайшлі складаныя выпрабаваньні. У эканамічным пляне абедзьве нашыя дзяржавы дасягнулі многага.

Адбыліся зьмены і ў сьвядомасьці: людзі зразумелі, што яны мусяць працаваць самі на сябе, і ніхто за іх іхныя праблемы ня вырашыць. Мае землякі восеньню 2004 году паказалі сябе людзьмі, якія больш не дазваляюць маніпуляваць сабой. І пазьней яны ня раз праявілі сваю талерантнасьць, адказнасьць, узаемапавагу: калі падчас выбараў, іншых падзей праходзяць шматлюдныя мітынгі, часта несанкцыянаваныя, ні разу не было ўзброеных сутычак, нікога не арыштоўваюць, нікога не штрафуюць.

Што да арыенціраў Украіны: нядаўна мы ўступілі ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю, ужо даўно мы ў Радзе Эўропы, маем намер уступіць у Эўрасаюз і гатовыя паглыбляць стасункі з НАТО — як з самай эфэктыўнай і масавай арганізацыяй калектыўнай бясьпекі. Наш прэзыдэнт Віктар Юшчанка сказаў нядаўна, што ўступленьне Ўкраіны ў НАТО — не пытаньне выбару, а пытаньне часу, і гэты час дадзены для сьвядомага прыняцьця рашэньня на рэфэрэндуме.

**НБ: У Беларусі зь нядаўняга часу грамадзкія арганізацыі вымушаныя плаціць за арэнду памяшканьняў у дзесяць разоў больш. Гэта можа стаць сьмяротным ударам, напрыклад, для чарнобыльскіх ці экалягічных саюзаў. Як адаб'ецца гэта на дзейнасьці ўкраінскіх грамадзка-культурных аб'яднаньняў у Беларусі?**

**ІЛ:** Нэгатыўна. Гэта праблема існуе. Многім грамадзкім арганізацыям не пад сілу плаціць па такіх цэнах. У Беларусі грамадзкія арганізацыі ня могуць атрымліваць дапамогу ад бізнэсу, як гэта магчыма ва Ўкраіне. Наколькі я ведаю, уся аплата арэнды ідзе праз Кіраўніцтва справамі прэзыдэнта. Я зьбіраюся размаўляць на гэты конт у міністэрствах замежных справаў і культуры. Ва ўсім сьвеце грамадзкія арганізацыі падтрымліваюцца дзяржавай, а таксама спонсарамі зь ліку прыватных асоб.

## Візы, мяжа і Хатынь

**НБ: Якія найбольш сур'ёзныя праблемы ў стасунках паміж Украінай і Беларусьсю? У геапалітычным пляне нашыя дзяржавы — канкурэнты ці партнэры?**

**ІЛ:** Мы не павінныя быць канкурэнтамі, каб не падарваць патэнцыял адзін аднаго. Мы павінныя быць разам, але дзеля пэўных мэтаў. Калі ў нас ёсьць супольныя каштоўнасьці, такое аб'яднаньне магчыма. Мы суседзі. У нас супольная гісторыя. Мы прайшлі ўжо пэрыяд разгубленасьці, калі кожны мусіў выжываць сам па сабе. Цяпер у нас пайшлі ўгару эканамічныя адносіны. Праўда, ёсьць фактары, якія стрымліваюць працэс. Чаму, скажам, інвэстыцыі з Украіны не ідуць у Беларусь, а ідуць у Вугоршчыну, Славакію, Баўгарыю? Заканадаўства наша адрозьніваецца ад беларускага больш, чым ад заканадаўстваў эўрапейскіх краінаў.

Яшчэ для мяне застаецца незразумелым і прыкрым, чаму Беларусь з 1997 г. не ратыфікуе дамову пра межы. Дэмаркацыя межаў — гэта і знак павагі да суседа, і зьняцьце ўмоваў для парушэньня мяжы грамадзянамі краін, і першы крок да іх зьнікненьня, да іх незаўважнасьці для грамадзян, як мы гэта назіраем цяпер у краінах ЭС.

**НБ: Ці даводзілася Вам сутыкацца зь непаразуменьнямі ці варожым стаўленьнем да Ўкраіны?**

**ІЛ:** Увогуле, беларусы вельмі зычліва ставяцца да ўкраінцаў. Але нашыя консулы час ад часу сутыкаюцца з прыкрымі сытуацыямі, датычнымі ўкраінскіх грамадзян. Напрыклад, непрымальным зьяўляецца тое, што беларус на тэрыторыі Ўкраіны можа знаходзіцца без рэгістрацыі 90 дзён, а ўкраінец у Беларусі — толькі 3 дні. Гэта выглядае, як аднабаковае ўвядзеньне Беларусьсю візавага рэжыму. Гэта стрымлівае і разьвіцьцё бізнэсу: людзі цяпер звыклі хутка перасоўвацца, не марнуючы часу на нейкія незразумелыя працэдуры...

Даводзілася сустракаць неадэкватнае стаўленьне да імкненьня нашай краіны далучыцца да супрацоўніцтва ў рамках ЭС і Паўночнаатлянтычнага блёку. Пры гэтым забываюць, што і Беларусь супрацоўнічае з НАТО, і што Расея мае з НАТО 12 супольных праграм — і гэта не выклікае ні ў кога пытаньняў.

Апошнім часам заўважаю накручваньне сытуацыі вакол трагедыі Хатыні. Нехта перакладае ўсю адказнасьць за гэтую трагедыю на мітычны ўкраінскі батальён. Хіба гэты батальён меў нейкія шаўроны, знакі ўкраінскай прыналежнасьці? Не. А ці мела тады Ўкраіна сваю дзяржаву? Не. Гавораць, што начальнікам яго быў украінец. Але ж гэты чалавек — як я ведаю зь беларускіх СМІ — нарадзіўся ў 1915 г. у Расейскай імпэрыі, вучыўся ў СССР, быў афіцэрам Чырвонай Арміі. Частка паліцэйскіх была прывезеная з-пад Кіева. Але гэтыя людзі былі набраныя зь ліку савецкіх ваеннапалонных, і няма ніякіх падставаў называць іх украінцамі. Сярод гэтых былых савецкіх салдат — грамадзян СССР — былі людзі розных нацыянальнасьцяў. І нехта ўжо камэнтуе ў інтэрнэце: «Спачатку спалілі Хатынь, цяпер імкнуцца ў НАТО. Вось такія ў нас суседзі...» Падобныя штампы і спэкуляцыі не спрыяюць сур'ёзным абмеркаваньням нашай супольнай гісторыі.

## Галадамор

**НБ: Сёлета Ўкраіна ўпершыню ўшаноўвала памяць ахвяр Галадамору. Чаму Вы лічыце гэта важным?**

**ІЛ:** Галадамор быў арганізаваны савецкай уладай для зьнішчэньня ўкраінскіх сялян — асновы нацыі. Мы нікога, акрамя сталінскага рэжыму і яго камуністычнай ідэалёгіі, не вінавацім. Таму для нас дзіўна гучаць выказваньні: так, Галадамор быў, але ў нас неадназначнае стаўленьне да гэтага. Якая тут можа быць неадназначнасьць? Гэта ж проста кашчунна. Як напісана ў Эвангельлі: так — так, не — не, а што паміж імі — тое ад лукавага.

## Ці дачакаемся?

**НБ: Тэма Тараса Шаўчэнкі праходзіць чырвонай ніткай нашай сёньняшняй размовы. Таму апошняе пытаньне я пазычу ў клясыка, які напісаў калісьці: «Ці ж дачакаем Вашынгтона з новым і праведным законам? А дачакаемся ж калісь». Як спадар пасол лічыць, дачакаемся?**

**ІЛ:** Дачакаемся, калі ня будзем сядзець склаўшы рукі. Калі Шаўчэнка пісаў гэтыя радкі, зь мільёнаў яго землякоў, можа, толькі некаторыя ведалі пра тое, хто такі Вашынгтон і што ён змагаўся за незалежнасьць сваёй дзяржавы. Але Шаўчэнка адчуваў неабходнасьць перамен для свайго народу. За гэта тагачасны бацька ўсіх славян Мікалай І адправіў яго ў салдаты на 10 год... Мае землякі зразумелі, што ніхто за нас нашую працу ня выканае. Ні Вашынгтон — ні той, ні іншы, — ні Масква, ні Варшава, ні Брусэль. Ёсьць пэўны ўзровень заскарузласьці, нездаровага ўспрыняцьця рэалій, і іх трэба пераадольваць.

На жаль, і ва Ўкраіне, і ў Беларусі мы яшчэ вырашаем пытаньні, якія ў іншых эўрапейскіх краінах вырашылі ўжо сто год таму.

# Чорна-белы сьвет

Піша Віталь Тарас.

Шырока адзначаць саракагодзьдзе з дня нараджэньня не прынята — кажуць, кепская прыкмета. Адзначаць сорак гадоў з дня сьмерці чалавека юбілейным артыкулам тым больш не выпадае. Нават калі гэты чалавек — Марцін Лютэр Кінг. Але такога чалавека і ягоную трагічную гібель, прынамсі, варта ўспомніць. Хоць гадавіна сьмерці Кінга засталася амаль не заўважанай у патоку паведамленьняў на розныя іншыя тэмы…

## У яго была мара

4 красавіка 1968 г. пастар Марцін Лютэр Кінг быў застрэлены на бальконе гатэлю «Ларэйн» у Мэмфісе, куды вядомы змагар за грамадзянскія правы прыбыў, каб падтрымаць страйк тамтэйшых камунальнікаў. Той год быў у ЗША шчодрым на гучныя палітычныя забойствы. Усяго праз два месяцы ў Каліфорніі будзе застрэлены кандыдат на прэзыдэнта ЗША сэнатар Робэрт Кенэдзі, брат Джона Кенэдзі, забітага ў 1963-м.

У забойстве Кінга прызнаўся Джэймз Эрл Рэй, дробны злодзей і расіст. На вінтоўцы з аптычным прыцэлам «Рэмінгтан», зь якой была выпушчаная сьмяротная куля, паліцыя знайшла адбіткі ягоных пальцаў. Праўда, калі суд прыгаварыў Рэя да 99 гадоў турмы, ён заявіў, што змушаны быў узяць на сябе віну, каб пазьбегнуць электрычнага крэсла. Памёр Рэй у турме ў 1998 г.

На пахаваньне Марціна Лютэра Кінга ў Атланце прыйшлі 150 тысяч чалавек. Прэзыдэнт ЗША Ліндан Джонсан абвесьціў агульнанацыянальную жалобу.

Трэці панядзелак году ў ЗША цяпер адзначаецца як Дзень Марціна Лютэра Кінга. Дзякуючы яму Кангрэс ЗША прыняў Акт аб правах, які фактычна ліквідаваў расавую сэгрэгацыю. Прамова Кінга «Я мару», зь якой ён выступіў падчас сацыяльнага маршу ў Вашынгтоне ў 1963 г., лічыцца адной з найлепшых у гісторыі прамоўніцкага мастацтва ў сьвеце. Прамова завяршалася словамі нэгрыцянскага сьпірычуэлзу: «Свабодныя нарэшце! Свабодныя нарэшце! Слава ўсёмагутнаму Богу, мы свабодныя нарэшце!» Гэтыя словы выбітыя і на магіле Кінга. Каталіцкая Царква прызнала яго пакутнікам за веру.

За сорак гадоў па яго сьмерці сьвет ня стаў менш складаным. Супярэчлівасьць і зьменлівасьць часу добра адлюстроўвае той факт, што цяперашні прэзыдэнт ЗША Джордж Буш прамаўляў словы падзякі вялікаму амэрыканцу за яго ўклад у амэрыканскую дэмакратыю падчас візыту ў сталіцу Харватыі Загрэб, на другі дзень пасьля таго, як Харватыя атрымала запрашэньне далучыцца да НАТО на саміце ў Бухарэсьце.

Сорак гадоў таму Харватыя ўваходзіла ў склад сацыялістычнай Югаславіі. А Румынія была сябрам Варшаўскага пакту, створанага Масквой у процівагу Паўночна-атлянтычнаму альянсу. У 1968 г. ніхто з палітыкаў ня мог прадказаць саміт НАТО, на якім будуць разглядацца прыём у гэты блёк Украіны і Грузіі.

Яшчэ менш верагодным падалося б тады амэрыканцам, што сярод галоўных кандыдатаў на пост прэзыдэнта ў 2008-м годзе будуць жанчына і цёмнаскуры прэтэндэнт. Ужо сёньня, бадай, мала хто сумняецца, што на фінішы 4 лістапада застануцца рэспубліканец Маккейн і дэмакрат Барак Абама. І толькі цуд можа дапамагчы выйграць рэспубліканцам. У тым, што для Амэрыкі гэта рэальнасьць, ёсьць і заслуга Марціна Лютэра Кінга, які змагаўся за роўныя правы ўсіх людзей незалежна ад колеру скуры.

## Чорныя пачынаюць

Нездарма амэрыканскі пісьменьнік Курт Ванэгут пісаў, што будучыню вызначаюць не палітыкі і не навукоўцы, але аўтары фантастычных раманаў. Большасьць тэхнічных цудаў, апісаных Жулем Вэрнам, хутка зрабіліся рэальнымі дасягненьнямі навукі й тэхнікі (касьмічная станцыя ЭС мае назву «Жуль Вэрн»). Назва сэрыі знакамітых мультымэдыя-плэераў фірмы «Эпл» iPod была падказаная фільмам Стэнлі Кубрыка «Адысэя-2000», дзе такую ж назву меў адмысловы касьмічны модуль.

Яшчэ не пасьпеў сысьці з экранаў фантастычны фільм, дзеяньне якога адбываецца ў далёкай будучыні, дзе выява Арнольда Шварцэнэгера фігуруе ў якасьці партрэта колішняга прэзыдэнта ЗША, як выканаўца ролі Тэрмінатара ўжо перамог на выбарах губэрнатара Каліфорніі. Праўда, стаць прэзыдэнтам яму пакуль не дазваляе закон — Шварцэнэгер імігрант.

Пасьля бліскучых роляў Дэнзэла Ўошынгтана, Ўэслі Снайпса, Моргана Фрымэна (Марфэй у «Матрыцы») і Ўіла Сьміта (адзін зь «людзей у чорным») амэрыканскі глядач, трэба думаць, даўно зачакаўся зьяўленьня ня менш бліскучага кандыдата ў прэзыдэнты сярод афраамэрыканцаў. Цікава, што самі афраамэрыканцы, то бок — нашчадкі нэграў, вывезеных белымі гандлярамі з Афрыкі ў якасьці рабоў у ЗША, лічаць Барака Хусэйна Абаму як бы не зусім сваім. І ня толькі таму, што ягоная маці — белая амэрыканка (продкі якой, да таго ж, былі плянтатарамі!) а бацька — грамадзянін Кеніі. І не таму, што Барак нейкі час жыў і вучыўся ў Інданэзіі. Але яшчэ таму, што ён ніколі ня ўдзельнічаў у барацьбе за правы нэграў у Штатах, у адрозьненьне ад многіх чарнаскурых палітыкаў, для якіх праваабарончая дзейнасьць станавілася падмуркам іхнай кар’еры.

Характэрна, што Барак Абама ня браў непасрэднага ўдзелу і ў цырымоніі ў Мэмфісе (штат Тэнэсі), прысьвечанай гадавіне сьмерці Марціна Лютэра Кінга — у той момант палітык быў заняты перадвыбарчай кампаніяй у штаце Індыяна.

З другога боку, у такой пазыцыі кандыдата ад дэмакратаў ёсьць свая перавага. Ён не пазыцыянуе сябе як абаронцу афраамэрыканцаў, а выступае як шырокі палітык, для якога аднолькава важныя правы і інтарэсы ўсіх амэрыканцаў, у тым ліку і прадстаўнікоў расавых або іншых меншасьцяў. У ягонай праграме больш важнае месца, чым правы, скажам, імігрантаў, займаюць праблема вываду амэрыканскіх войскаў з Іраку ды разьвіцьцё альтэрнатыўных крыніц энэргіі.

Тым ня менш, знаходзяцца палітычныя аглядальнікі ў Расеі, якія ці то жартам, ці то ўсур’ёз заяўляюць, што з прыходам Абамы ў ЗША можа пачацца новая эра, паколькі ў ягонай сьвядомасьці (ці падсьвядомасьці?) тояцца зусім іншыя, адрозныя ад эўрапейскіх, каштоўнасьці. І што? Пачнецца глябальная вайна чорных зь белымі?

## Анджэла Дэвіс у поўны рост

Ня ўсё толькі кепскае было ў Савецкім Саюзе пры КПСС. У 1968 г. дзяржаўны антысэмітызм (па сутнасьці, адна з формаў расізму) калі і меў месца быць у сувязі з «агрэсіўнай палітыкай Ізраілю на Блізкім Усходзе», дык насіў строга кантраляваны і дазаваны характар. Уявіць сабе ў той час выступы з афіцыйнай трыбуны, кшталту таго, што дазваляюць сабе сёньня генэрал Макашоў у Расеі альбо кіраўнік беларускай дзяржавы, было проста


Барак Абама і Хілары Клінтан.

немагчыма. Тым больш немажлівым было нават на побытавым узроўні лаяць нэграў, асабліва амэрыканскіх. Ім жылося, паводле афіцыйнай прапаганды, горай за ўсіх у сьвеце. Фраза «а ў вас нэграў лінчуюць» доўгі час была каронным аргумэнтам ў ідэалягічнай барацьбе сацыялізму і капіталізму.

(Якім жа было адкрыцьцём для аўтара гэтых радкоў аднойчы даведацца, што сярод нэграў-пратэстантаў быў і застаецца агромністы працэнт… зацятых антысэмітаў. Вось табе і барацьба за роўнасьць.)

Ці трэба казаць, што забойства Марціна Лютэра Кінга стала сапраўдным сьвятам для ўсяго штату савецкіх прапагандыстаў і «палітынфарматараў». Крыху пазьней, усяго праз чатыры гады, тэмай нумар адзін для савецкай прэсы зрабілася нэгрыцянка Анджэла Дэвіс, якую кінулі ў турму паводле «сфальшаванага абвінавачаньня». Акцыі пратэсту пад лёзунгам «Свабоду Анджэле Дэвіс!» пракаціліся па ўсім сьвеце. Праўда, пасадзіць яе хацелі не за палітыку, а таму, што з ружжа, якое ёй належала, быў застрэлены судзьдзя. Паводле тагачаснага амэрыканскага закону, адказнасьць за забойства распаўсюджвалася і на ўладальніка зброі, нават калі ён ня меў дачыненьня да самога злачынства. Анджэла вырашыла зьбегчы ад правасудзьдзя, яе злавілі і пасадзілі ў турму на паўтара году. Пасьля гэта яна зрабілася сяброўкай ЦК кампартыі ЗША, а ў Маскве яе асабіста прымаў генэральны сакратар ЦК КПСС Леанід Брэжнеў.

Дагэтуль памятаю сваё ўражаньне ад карціны аднаго беларускага мастака, убачанай на пачатку 1970-х на выставе ў Мастацкім музэі БССР. Гэта быў партрэт Анджэлы Дэвіс у поўны рост. Асабліва запомніліся экзатычная пышная прычоска, танклявыя чорныя рукі ў наручніках, якія глядзеліся досыць сэксуальна, і лёгкая сукенка, на выгляд яўна зробленая не з амэрыканскай мануфактуры, а з таннага савецкага «сітчыка».

## Паліткарэкцыя

Інтэрнацыянальная прапаганда за савецкім часам дзейнічала, мабыць, яшчэ й таму, што ў Савецкім Саюзе чарнаскурых імігрантаў было няшмат. Затое сёньня ў Расеі б'юць усіх, каго называюць «панаехалі тут», незалежна ад іхнага колеру скуры, разрэзу вачэй ці формы носа. У тым ліку і нэграў.

Але ж нармальныя людзі заўсёды атрымлівалі асалоду ад музыкі Луі Армстранга, Арэты Франклін, Рэя Чарлза, Даяны Рос, хваляваліся за герояў амэрыканскіх фільмаў накшталт «Скаваных адным ланцугом» Стэнлі Крэймэра, захапляліся майстэрствам амэрыканскіх баскетбалістаў, баксэраў, лёгкаатлетаў. Алімпійскі чэмпіён у боксе Касыюс Клей, у наступным Мухамэд Алі, зрабіў цэлую эпоху ў спорце і палітыцы.

Некалі ўразілі кадры ў фільме Элема Клімава «Спорт, спорт, спорт…», узятыя з кінахронікі Алімпіяды 1936 году ў Бэрліне. Чым бліжэй тады падбіраўся да алімпійскага рэкорду ў скоках у даўжыню амэрыканскі цёмнаскуры атлет Джэсі Оўэнз, тым больш выразна нэрваваўся Гітлер у сваёй лёжы: ён ускокваў зь месца, узбуджана стукаў сябе па каленках. Арыйская тэорыя, якая ўзносіла моц белага чалавека, фізычную перавагу германскай расы, выдавалася сьмеху вартай.

Барацьба з расізмам, барацьба за роўныя грамадзянскія правы, якая дала ў ЗША несумненны станоўчы вынік, спарадзіла, аднак, яшчэ адну рэч, дакладней — артэфакт. Ён завецца паліткарэктнасьцю. Задуманая чыноўнікамі як падказка, свайго роду этычныя мыліцы для імігрантаў з усяго сьвету, паліткарэктнасьць рэжа вока ці не ва ўсіх галівудзкіх фільмах. Калі ў фільме ёсьць хоць адзін кепскі герой-афраамэрыканец, побач абавязкова павінен быць як мінімум адзін станоўчы герой з такім самым колерам скуры. Тое ж тычыцца арабаў, людзей са «славянскім выглядам», а таксама сэкс-меншасьцяў.

Думаецца, паліткарэктнасьць — гэта, усё ж, не зусім тое, пра што марыў Марцін Лютэр Кінг 45 гадоў таму. Ён казаў : «…Я мару, што прыйдзе дзень, калі наша нацыя дажыве да сапраўднага сэнсу свайго дэвізу: «Мы лічым натуральным, што ўсе людзі створаныя роўнымі».

Хутчэй бы і ў Беларусі гэта сталася для ўсіх натуральным.

# «Грахвыня, мне прысьніліся



# Каб хам нігды панам ня быў!

6 красавіка ў Купалаўскім віншавалі заслужанага артыста Беларусі Уладзімера Рагаўцова. Юбіляр, прыняўшы кветкі ад калегаў і падарунак ад прафсаюзаў, прачытаў блокаўскі верш — сваё акторскае крэда, выклікаўшы ў глядацкай залі яшчэ адну порцыю заслужаных авацыяў. Але ў спэктаклі «Каханьне ў стылі барока» яму дасталася толькі эпізадычная роля Шумыцкага, пра што ў гэты вечар даводзілася толькі шкадаваць. Відавочнымі «бэнэфіцыянтамі» сталі іншыя акторы. Піша **Аляксандар Фядута**.

Імаверна, «Каханьне ў стылі барока» — адзіная п’еса ўкраінскага драматурга Яраслава Стэльмаха, якую ў найбліжэйшыя гады зможа паглядзець беларускі глядач. П’еса добрая. І вельмі добры атрымаўся спэктакль, пастаўлены ў 2003 годзе Барысам Уторавым — цудоўным рэжысэрам і пэдагогам. І драматурга, і рэжысэра, на жаль, ужо няма сярод жывых. А спэктакль жыве. Калі б гукарэжысэр не замінаў акторам сваімі дынамікамі сьпяваць, было б і зусім цудоўна.

Старая камэдыя сытуацый. Графа (Ігар Пятроў) бацька заручыў зь яго кузынай Олянай (Юлія Шпілеўская). Прайшло восем гадоў, бацькі абаіх заручоных сышлі з гэтага сьвету, а малады граф жаніцца ня хоча. І прыдумаў ён выдаць за сябе — то бок за маладога — уласнага падлоўчага Онысыма (Мікалай Кучыц). Але служка Ярыся (гэтую спрытную субрэтку бліскуча грае Марына Гардзіёнак) усё падслухала, данесла паненцы, а тая здолела так павярнуць усю справу, што граф і віну сваю прызнаў, і ў яе закахаўся... Увогуле, усё добра, што добра заканчваецца.

Дзіўныя справы Госпада нашага і неспавядальныя шляхі Яго! Граф у выкананьні Ігара Пятрова такі вытанчаны «кавалеж», што ня верыцца нават неяк у яго злосны намер ашукаць зару-

# вашыя ногі...»

чоную. І ня верыцца, што ён здольны быць хамаватым са служкам Стэпанам (выбітная праца Сяргея Чуба), што ён можа загадаць яму пакінуць дзьвюх прыбылых у замак жанчын у цемры, без кавалка хлеба, бязь цёплай вады, з адным недагаркам сьвечкі — фі! Але, зь іншага боку, з халасьцяцкім жыцьцём яму зусім ня хочацца разьвітвацца. Нават цікаўнасьць не адольвае яго: а як яна выглядае, гэтая мая кузына, якую я бачыў апошні раз восем гадоў таму? Чаго ня зробіш, каб захаваць свабоду?

І, вырашыўшы падмяніць сябе ў вачах маладой на вечна п’янага, выкачанага ў пер’і, сьмярдзючага Онысыма, ён ведае, што робіць: яму патрэбная яе добраахвотная адмова! А хто ж з паненак, што прыехалі з самага сапраўднага Парыжу, прыме вось такога жаніха, як Онысым?

Але якім бы п’яным і камічным ні выглядаў у першай дзеі Онысым у выкананьні Мікалая Кучыца, у другой дзеі ён ужо зусім іншы! Пераканаўшыся, што ён на самай справе і ёсьць — «грахв», п’яны падлоўчы раптоўна праймаецца пачуцьцём уласнай годнасьці.

Калі чытачы ня бачылі, як грае Мікалай Кучыц, стоячы сьпінай да залі гледачоў, я параіў бы купіць квіткі загадзя. Хвіліну таму ён быў усяго толькі згорбленым, тоўстым, нязграбным мужыком — і раптам выпростваецца пастава, рукі па-майстэрску прыводзяць да ладу прычоску. Ён — «грахв», толькі натура засталася хамскай. Пахамску пхне ён нагой Стэпана, пахамску зарагоча, узгадаўшы, як падклаў другому падлоўчаму, Гаўрылу, граблі, а той на іх наступіў... Вядома, Кучыц утрырue сьмешныя рысы ў абліччы свайго героя, але сутнасьць — хам раптам стаў панам, атрымаўшы ўладу над «людзьмі» — праз гэта менш страшнай ня стала. Онысым ня толькі вонкава пераўтварыўся — тое самае «грахвства» абудзіла ў ім усё, што было здушана столькі гадоў: лёкай-баягуз, стаўшы панам, узьнёс хамства ў стыль свайго паўсядзённага жыцьця — хай сабе нават у чырвоным камзоле і ў вышытым залатым халаце (вось і прыгадаеш песьню Віктара Шалкевіча:

> Бяры залатоўку, мадліся, што сіл,
> Каб хам нігды панам ня быў!).

Праз гэта добраахвотная пакута, прынятая на сябе графіняй Олянай, падвойваецца. Яна бачыць перад сабою ня пана, але хама, хама скончанага, — і вымушаная, дзеля выкананьня да канца гульні, якую сама і прыдумала, патураць яму, захапляцца ім. Ёй — Юлія Шпілеўская ў пэўны момант пачынае весьці сваю лінію са шчырым трагічным надрывам — гэтае прыроднае, натуральнае хамства напаўп’янога падлоўчага здаецца больш даравальным за цынічны падман такога высакароднага, такога далікатнага, такога міленькага... гм-гм... графа, адным словам.

Але, зь іншага боку, і ў яе — у такую рашучую, вытанчаную, чорнавалосую, чарнавокую, зграбную, высокую — м-м-м! — цяжка не закахацца. І абсалютна відавочна, што ў Оляну ў выніку закаханыя абодва — і граф, і «грахв». І закаханы Онысым дазваляе сабе граць у жмуркі з пакаёўкамі, а закаханы граф, чытаючы кніжку ў аксамітнай чырвонай вокладцы, думае, як бы насьмеліцца і прызнацца сваёй заручонай — такой... такой... спакусьлівай — так! спакусьлівай — не дарма Онысыму карціць аблапаць яе. Так і граф, удаючы падлоўчага, ёй жа здуру, прыняўшы яе за служку, прапануе сходзіць у клуню...

Увогуле, «грахвыня», ці хочаце Вы вялікага і чыстага каханьня? У двух варыянтах? Ці ў клуні з графам, ці ў спальні з п’яным падлоўчым? Абодва кавалеры — да Вашых паслугаў!

Вось наконт закаханых служак сумненьняў няма ніякіх. Тут варыянтаў быць ня можа ў прынцыпе. Марына Гардзіёнак грае клясычную субрэтку ў духу Марыво, Сяргей Чуб — такога сабе хітраватага мальераўскага Каўеля. Уласьцівы гэтым пэрсанажам гумар, які трэба, каб крыху травэстыяваць высокія пачуцьці гаспадароў, зразумела, выклікае значна большы водгук у залі. Але акторы пры гэтым ведаюць меру, нідзе не пераігрываюць. І хаця Ярысі патрэбны перакладчык з «кабылячай мовы» на мову нармальных чалавечых пачуцьцяў, у іх ігры абышлося бяз пошласьці і «жарабяцінкі». (Як мне падаецца, гэтая асаблівасьць іх акторскіх талентаў была запатрабаваная і ў «Слугу двух гаспадароў».)

Усе выканаўцы купаюцца ў тэксьце камэдыі, як морапрадукты ў соўсе-кактэйлі: ясі ад душы — атрымлівай асалоду! Нават у абсалютна бясслоўнай (адна фраза, па-мойму?) ролі Кушча (ёсьць і напраўду ў гэтым сьпітым пэрсанажы нешта расьліннае) Вячаслаў Паўлюць умудраецца сыграць цэлае жыцьцё, прымусіць гледача палюбіць сябе і рэагаваць на кожны ўсхліп яго героя як на маналёг Гамлета.

Але тры цэнтральныя пэрсанажы гэтай гісторыі пра каханьне ўсё адно граюць ня столькі камэдыю, колькі трагікамэдыю. Таму што ў прынцыпе для іх — па сканчэньні сюжэту — усё зьмянілася карэнным чынам. Справа нават ня ў тым, што граф ажаніўся з Олянаю і разьвітаўся са свабодаю, што так нечакана надакучыла яму. Проста Онысым ніколі не забудзе той тыдзень, які ён правёў у графскіх пакоях, адчуваючы сябе паўнавартасным гаспадаром-распарадчыкам чужых лёсаў. Граф ніколі не забудзе сваёй віны перад жанчынай, якую ён нават не захацеў пабачыць, і так абразіў, і якая яму даравала — пазьней даравала — і нават пагадзілася стаць яго жонкай. А Оляна ўжо дакладна не забудзе, як яе будучы сужонец заляцаўся да прыгожанькай пакаёўкі і клікаў яе ў клуню — і што з таго, што гэтай пакаёўкай была яна сама? Бо сёньня яна, а заўтра ў клуню — зь іншай?!

Камэдыя сытуацый далёка не такая адназначна лёгкая, як можа падацца. І «Ноч памылак» Голдсміта, і «Жаніцьба Фігара» Бамаршэ напісаныя людзьмі, якія вельмі ўважліва чыталі Марыво. А Стэльмах уважліва чытаў і Голдсміта, і Бамаршэ. Таму і напісаў ён, хутчэй, трагікамэдыю, чым...

...Але тут на сцэну выйшаў Валер Раеўскі і прапанаваў павіншаваць юбіляра.

Яно, вядома, правільна: шэсьцьдзесят пяць год — цалкам паважны ўзрост. Трэба ўшанаваць.

**Аляксандар Фядута,**
**глядач**

# Рэспубліка Зарэчча



**Бэларускія студэнты ўзялі ўдзел у сьвяткаваньні.**

1 красавіка ў Вільні — зусім ня Дзень дурняў. У гэты дзень тут штогод адзначаюць Дзень незалежнасьці гэтак званай Рэспублікі Зарэчча — краіны творчых людзей. Сёлета 11-ы раз. Як і заўжды, на межах рэспублікі былі выстаўленыя пасты памежнікаў, а ў пашпарты гасьцей краіны ставіліся адпаведныя штампы.

Ва ўрачыстым шэсьці з нагоды сьвята ўзялі ўдзел і беларускія студэнты.

Несумнеўным цьвіком праграмы стала адкрыцьцё трох новых табліц з тэкстам зарачанскай Канстытуцыі. Цэнтральнае месца ў дадатку да літоўскага, францускага і ангельскага варыянтаў Закону рэспублікі займае тэкст на беларускай мове.

Рэспубліка Зарэчча — гэта віленскі раён кампактнага пражываньня мастакоў, артыстаў і іншых творчых людзей. Яго яшчэ называюць літоўскай Хрысьціяніяй. Адзінаццаць гадоў таму раён меркавалі зьнесьці, але творцы выкупілі яго ў гарадзкога самакіраваньня.

Так некалькі дзясяткаў старых будынкаў за ракой Вялейка сталі рэспублікай са сваёй канстытуцыяй, прэзыдэнтам, урадам, міністэрствамі ўнутраных і замежных справаў.

## Канстытуцыя Зарачанскай Рэспублікі




1. Чалавек мае права жыць побач зь Вялейкай, а Вялейка — цячы каля чалавека.

2. Чалавек мае права на гарачую ваду, ацяпленьне зімою й чарапічны дах.

3. Чалавек мае права памерці, але не абавязаны.

4. Чалавек мае права на памылкі.

5. Чалавек мае права быць адзіным і непаўторным.

6. Чалавек мае права любіць.

7. Чалавек можа быць нялюбым, але гэта не абавязкова.

8. Чалавек мае права ня быць знакамітым і вядомым.

9. Чалавек мае права ленавацца альбо нічога не рабіць.

10. Чалавек мае права любіць і даглядаць котку.

11. Чалавек мае права рупіцца пра сабаку да канца дзён аднаго зь іх.

12. Сабака мае права быць сабакам.

13. Котка не абавязаная любіць свайго гаспадара, але ў цяжкую хвіліну мусіць прыйсьці яму на дапамогу.

14. Чалавек мае права часам ня ведаць, ці мае ён абавязкі.

15. Чалавек мае права сумнявацца, але гэта не абавязак.

16. Чалавек мае права быць шчасьлівым.

17. Чалавек мае права быць нешчасьлівым.

18. Чалавек мае права маўчаць.

19. Чалавек мае права верыць.

20. Чалавек ня мае права чыніць гвалт.

21. Чалавек мае права ўсьведамляць




Палітоўску Зарэчча — UŽupis.



сваю драбнату і веліч.

22. Чалавек ня мае права квапіцца на вечнасьць.

23. Чалавек мае права разумець.

24. Чалавек мае права нічога не разумець.

25. Чалавек мае права быць розных нацыянальнасьцяў.

26. Чалавек мае права сьвяткаваць або не сьвяткаваць свой дзень нараджэньня.

27. Чалавек абавязаны прыгадаць сваё імя.

28. Чалавек мае права дзяліцца тым, што мае.

29. Чалавек ня мае права дзяліцца тым, чаго ня мае.

30. Чалавек мае права мець братоў, сясьцёр і бацькоў.

31. Чалавек можа быць свабодным.

32. Чалавек адказны за сваю свабоду.

33. Чалавек мае права плакаць.

34. Чалавек мае права быць незразуметым.

35. Ніхто ня мае права зрабіць іншага вінаватым.

36. Чалавек мае права быць асаблівым.

37. Чалавек мае права ня мець аніякіх правоў.

38. Чалавек мае права не баяцца.

Не перамагай

Не бараніся

Не здавайся

Гэтыя словы дазваляюць Зарэччу адмовіцца ад войска, раздаць сябе ўсім і даручыць сябе небу.

**antanian.draniki.com**

# «Піпі Доўгаяпанчоха» Астрыд Ліндгрэн па-беларуску

«Піпі Доўгаяпанчоха — самая моцная, вясёлая, добрая і багатая дзяўчынка ў сьвеце. Яна павандравала па морах і акіянах і ўрэшце разам з канём і малпаю Спадаром Нільсанам пасялілася ў Віле Кавардакуле. У суседнім доме жывуць Томі і Аніка, якім стала нашмат весялей, калі зьявілася сяброўка. Бо Піпі гатуе імберцавае печыва проста на падлозе, падымае каня на выцягнутых руках і гуляе ў квача з паліцэйскімі, якія прыходзяць забраць яе ў дзіцячы дом», гаворыцца ў анатацыі да кнігі.

Сусьветны бэстсэлер шведзкай пісьменьніцы пераклаў на беларускую мову Дзьмітры Плакс. Рэдактар кнігі — Юрась Бушлякоў. Дызайн і макет кнігі падрыхтаваў Генадзь Мацур. Кніга выйшла ў выдавецтве Зьмітра Коласа.

На прэзэнтацыі першага беларускага выданьня «Піпі Доўгайпанчохі» будуць прысутнічаць дачка Ліндгрэн Карын Нюман — тая самая дзяўчынка, якая шмат гадоў таму прыдумала імя для гераіні і натхніла маці на напісаньне кніжкі; шведзкая літаратуразнаўца і пісьменьніца Ула Лундквіст і Дзьмітры Плакс.

Выданьне ілюстраванае арыгінальнымі малюнкамі дацкай мастачкі Інгрыд Ванг Нюман.

Прэзэнтацыя кнігі адбудзецца 10 красавіка ў мастацкай галерэі «Лябірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Пачатак у 17.30.

Арганізоўваюць прэзэнтацыю Аддзяленьне Пасольства Швэцыі ў Менску пры падтрымцы Швэдзкага Інстытуту сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай.




**Астрыд Ліндгрэн. Піпі Доўгаяпанчоха.** — Менск: Зьміцер Колас, 2008. — 176 с.: іл.

# Казачны сьвет Астрыд Ліндгрэн

Фэстываль дзіцячага швэдзкага кіно, прысьвечаны 100-гадоваму юбілею пісьменьніцы. Ангельскія субтытры і беларускі пераклад.

У рамках фэстывалю будуць паказаныя тры фільмы па матывах твораў А.Ліндгрэн. Паказы пройдуць з 12 па 14 красавіка ў Менску, к-тр «Цэнтральны» (пр. Незалежнасьці, 13) і з 16 па 18 красавіка ў Гомелі, к-тр імя Калініна (вул. Камунараў, 4).

«Кале Блюмквіст і Размус». Фільм расказвае гісторыю дзяцей з маленькай швэдзкай вёсачкі. Яны падзеленыя на дзьве варожыя групы — белыя і чырвоныя ружы — і змагаюцца за камень, які, здаецца, ня мае ніякай каштоўнасьці. Але бесклапотнае лета раптам напаўняецца праблемамі: бандыты захапіла прафэсара і яго пяцігадовага сына Размуса і патрабуюць формулу аднаго з вынаходніцтваў прафэсара. Час для Кале Блюмквіста ізноў стаць дэтэктывам.

«Ты здурнела, Мадыкен?». Мадыкен — сямігадовая дзяўчынка. Яна жыве з мамай, татам, малодшай сястрычкай Лісабэт, пудзелем Сасо, кацяняткам Гусан і сяброўкай Альвай у вялікім чырвоным доме ля ракі ў маленькім швэдзкім гарадку. Дзеяньне адбываецца ў 1915 годзе. У Мадыкен узьнікае шмат дзіўных ідэяў, праўда, яна ніколі іх не ажыцьцяўляе — да аднаго цудоўнага моманту.

«Роньня, дачка разбойніка». У тую ноч, калі нарадзілася Роньня, над гарамі бушавала навальніца. Але Мат быў настолькі рады нараджэньню дачкі, што не заўважаў непагоды. Яго род будзе працягвацца, а жыцьцё Боркі абарвецца. Борка — галоўны вораг, а бацька і дзядуля Боркі былі галоўнымі ворагамі бацькі і дзядулі Мата. Але ў тую ноч, калі нарадзілася Роньня, жонка Боркі нарадзіла сына. Роньня вучыцца скакаць і танчыць ды крычаць разам зь іншымі разбойнікамі, але яна адчувае сябе адзінокай у лясах Мата. Аднойчы яна сустракае Бірка. У хуткім часе паміж дзьвюма варожым групоўкамі разгараецца велізарны канфлікт, у цэнтры якога і знаходзяцца Роньня і Бірк. Яны мусяць сустракацца таемна ў самай гушчэчы лесу. Прыгоды пачынаюцца…



**Менск**

**12 красавіка** — «Кале Блюмквіст і Размус». Пачатак а 11-й і 13-й

**13 красавіка** — «Ты здурнела, Мадыкен?» Пачатак а 11-й і 13-й

**14 красавіка** — «Роньня, дачка разбойніка». Пачатак а 13-й і 15-й

**Гомель**

**16 красавіка** — «Ты здурнела, Мадыкен?»

**17 красавіка** — «Роньня, дачка разбойніка»

**18 красавіка** — «Кале Блюмквіст і Размус»

Пачатак сэансаў а 14-й

## КАНЦЭРТЫ

**N.R.M.**

**15 красавіка** — дадатковы акустычны канцэрт N.R.M. **у клюбе «Графіці» (зав. Калініна, 16)**. Даведкі па т.: (029) 671–58–65, (029) 254–49–09. **Пачатак у 20.00.**

**Біт-фэстываль**

**12 красавіка а 18-й у актавай залі БДУІР** — «Менскі біт–фэстываль. Праз сорак гадоў» — юбілейны вечар прысьвечаны 40–годзьдзю першага біт–фэстывалю ў РТІ. Выступяць **удзельнікі першага фэстывалю**, а таксама гурты **Madera Hard Blues**, **«Князь Мышкін»**, **White Night Blues**, адбудзецца паказ унікальнага фільму пра фэст 1968 году. Даведкі і замова квіткоў: (029) 378–48–96

**Арт-ракета ў 60-я**

**12 красавіка а 19-й у «Графіці» (зав. Калініна, 16)** — гурт **Zombie Zoo** з праграмай «Арт–ракета ў 60–я». Т.: (029) 179–99–18, (029) 779–99–18

**«Абшар»**

**14 красавіка а 19.30 у «Графіці»** — гурты **«Абшар»** і **The Blackmail**.

**Залатагорская ліра**

**13 красавіка а 20-й у Касьцёле Сьвятога Роха (пр. Незалежнасьці, 44а)** — канцэрт «Залатагорская ліра» з удзелам **Тацяны Бяльковіч**, **Ільлі Кубліцкага**, ансамбля **«Сальтарэла»**, **Сьвятланы Немагай**, хору **«Залатая Горка»**

## ІМПРЭЗЫ

**Вечарына музыкі і паэзіі**

**24 красавіка у менскай бібліятэцы № 5 (вул.Казлова, 2)** адбудзецца вечарына музыкі і паэзіі, прысьвечаная Сусьветнаму дню кнігі. Бяруць удзел барды **Натальля Пушкарова**, **Павел Кузіч**, паэты **Зьміцер Вішнёў**, **Рагнед Малахоўскі**, **Юлія Новік**, **Ганна Федарук**, **Віка Трэнас**. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

**«Галіяфы»**

**29 красавіка у вялікай залі Дома літаратара (вул.Фрунзэ, 5)** адбудзецца прэзэнтацыя выдавецтва «Галіяфы». У межах праекту будуць прадстаўленыя кнігі: «Мільярд удараў» Юр’я Станкевіча, «Экзыстэнцыйны пэйзаж» Вікі Трэнас, «Забі ў сабе Сакрата!» Веры Бурлак і Віктара Жыбуля, а таксама «Сто дарог» Уладзіміра Несьцяровіча. У вечарыне возьмуць удзел: **Юрась Пацюпа**, **Адам Глёбус**, **Пятро Васючэнка**, **Юрась Барысевіч**, **Зьміцер Вішнёў**, **Вольга Гапеева**, **Інэса Кур’ян**, **Арцём Кавалеўскі**, **Уладзімер Гніламёдаў**, **Аксана Спрынчан**, **Ірына Шаўлякова**, **Серж Мінскевіч**, **Анка Упала**, гурты **«Рацыянальная дыета»**, **Anima Una**, **Recha**, **MinskStar квартэт**, суполка **«Тэатар псыхічнае неўраўнаважанасьці»**. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны




## ПРЭЗЭНТАЦЫЯ

**Кніга і сайт Леаніда Маракова**

**16 красавіка на Управе БНФ (вул.Варвашэні, 8)** — тры падзеі. Сьвяткаваньне 50–годзьдзя Леаніда Маракова, прэзэнтацыя сайту www.marakou.by, а таксама прэзэнтацыя новай кнігі апавяданьняў Л.Маракова «Сшытак забітага кантрабандыста». Падарункі неабавязковыя. Яўка абавязковая. **Пачатак а 18-й**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Мае чарнічныя ночы»

**Мае чарнічныя ночы** (My Blueberry Nights)

Ганконг — Кітай — Францыя, 2007, каляровы, 95 хв.

**Рэжысэр:** Вонг Кар Вай

**Ролі выконваюць:** Нора Джонз, Джад Лоў, Дэйвід Стрэтэйрн, Цім Рот, Наталі Портман, Рэйчэл Ўайс

**Жанр:** Рамантычная драма

**Прызы, фэсты:** Намінацыя на «Залатую галіну» Канскага кінафэсту

**Адзнака:** 6,5 (з 10)

Маладая дзяўчына Элізабэт (Нора Джонз) разьвітваецца са сваім сябрам і пакідае ключы ад кватэры ў кавярні, гаспадар якой (Джад Лоў) гандлюе чарнічнымі пірагамі. Элізабэт вандруе па Амэрыцы і спрабуе знайсьці сябе. Чужыя драмы праходзяць перад вачыма гераіні, але яе ўласнае шчасьце — у пакінутай кавярні...

Карціна Вонга Кар Вая — пяшчотная рамантычная драма, пастаўленая, як «Любоўны настрой» акварэльнымі фарбамі. Колеры чарнічныя і белыя, пунсова–чырвоныя і блакітныя, ультрамарынава–эратычныя — мяккія, як дотык і дзявочая мара. (Апэратар стужкі Дарыюс Гонджы). Фарбы зьдзіўляюць, сьняцца, трызьняцца — але й ня кідаюцца ў вочы, а толькі падкрэсьліваюць любоў.

Гэта любоў–залежнасьць, жарсьць: няшчасны паліцэйскі (Дэйвід Стрэтэйрн) любіць віскі і страчвае жонку; юная карцёжніца (Наталі Портман) любіць покер і страчвае ўласнага бацьку.

Гэта любоў–недаказанасьць: былая любоў сышла, а ў новай ніяк не прызнацца. Марозіва на сонных вуснах Норы Джонз; Джад Лоў цалуе дзяўчыну.

Фільм як нізка апавяданьняў, як жыцьцё ў сьне, як пачуцьцёвасьць подыху ў мэгаполісе.

Але за пекнымі фарбамі, тонкай гісторыяй, дасьціпна стрыманай акторскай гульнёй няма нічога, акрамя візуальнага казытаньня. Гэта выдатнае каліграфічнае практыкаваньне, якое дэманструе майстэрства Кар Вая, але хавае адсутнасьць ідэй у яго.

Любоў прыйшла, сэрцы знайшлі адзін аднаго — шчасьце ёсьць, гледачы паплакалі.

Стужка ідэальная, для прагляду парамі — але толькі на адзін раз.

**Андрэй Расінскі**

## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**

**12 (сб)** — «Сымон–музыка»
**13 (ндз)** — «С.В.»
**15 (аўт)** — «Больш чым дождж»
**16 (ср), 17 (чц)** — «Чорная панна Нясьвіжу»
**18 (пт)** — «Маэстра»
**19 (сб)** — «Макбэт»

*ранішія спэктаклі*

**13 (ндз)** — «Сьнежная каралева»

*малая сцэна*

**11 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха»
**13 (ндз)** —Апэльсінавае віно»
**17 (чц)** — «Востраў Сахалін»
**18 (пт)** — «Адчыніце Кантралёру!»

**Тэатар беларускай драматургіі**

**11 (пт), 12 (сб)** — «Белы анёл з чорнымі крыламі»
**13 (ндз)** — «Прыгоды маленькай ведзьмы»
**13 (ндз)** — «Сталіца Эраўнд»
**15 (аўт)** — «Палёт над гняздом зязюлі»
**17 (чц)** — «Містэр Розыгрыш»
**18 (пт)** — «Неба ў дыямэнтах»
**19 (сб)** — «Адэль»

# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі

**Анатоль Лябедзька.**
Чалавечае і палітычнае ........................................ 19

**Ігар Ліхавы. Ніхто за нас нашую працу ня выканае.**
Гутарка з паслом Украіны ў Беларусі ........... 22

**Чорна-белы сьвет.**
Піша Віталь Тарас ................................................ 24

**«Грахвыня, мне прысьніліся вашыя ногі...»**
Адзін сэзон у Купалаўскім з Аляксандрам Фядутам ..................................... 26

**Рэспубліка Зарэчча.**
Дзяржава з Канстытуцыяй па–беларуску .. 28

## КАЛІ Б...

**...улады хацелі нешта супрацьпаставіць карце паляка.**



МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

**Функцыянэр:** Рады вам паведаміць, што кіраўніцтва БРСМ уводзіць новыя льготы для актывістаў. Цяпер вы маеце права ня толькі на бясплатную дыскатэку, але і аўтаматычна атрымліваеце даведку, што вашыя дзед і бабка — чыстакроўныя палякі. Гэта дае вам магчымасьць вучыцца ў польскіх ВНУ, езьдзіць са зьніжкай па Польшчы, халяўны гадавы Шэнген… Хіба «Малады фронт» можа прапанаваць нешта падобнае?

## СУР'ЁЗНА

### Матыў той самы

Намесьнік старшыні Беларускай сацыял–дэмакратычнай партыі (Грамада) Ігар Рынкевіч прапанаваў аб'явіць конкурс на назву маршу для масавых шэсьцяў дэмакратычных сіл і на напісаньне музыкі да яго. Тэкст ужо ёсьць. Ён пачынаецца з словаў «Мы, беларусы, зь імем–літвою», а згадцы пра «народаў братэрскі саюз» у тэксьце Рынкевіча адпавядае «Славім у Сьвеце Старым Эўразьвяз». «Верш, што зараз прапануецца, не прэтэндуе стаць новым гімнам краіны. Але ён прыкметна добра кладзецца на музыку сёньняшняга афіцыйнага гімну, словы якога ні дзяржаўныя дзеячы, ні спартоўцы, ні іншыя беларускія грамадзяне так і не захацелі вывучыць», — адзначыў І.Рынкевіч.

Мы, беларусы, зь імем–літвою
Меч уздымалі на крыжакоў.
Несьлі харугвы за мову і волю
Зь цёмных стагодзьдзяў да сьветлых вякоў.

Помнім гісторыі слаўныя даты.
Славім у Сьвеце Старым Эўразьвяз.
Верым: сузор'е ўзыдзе з–за кратаў,
Зоркі Эўропы зазьзяюць для нас...

Як паведаміў І.Рынкевіч, тэкст напісаў вядомы ў краіне паэт, які пажадаў захаваць інкогніта: «Ён працуе і ня хоча непрыемнасьцяў у выпадку таго, калі гэты тэкст разыдзецца ў масах». Якога кшталту непрыемнасьці могуць быць у аўтара гэтага «шэдэўру» — не ўдакладняецца.

**СМ, паводле БелаПАН**

# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ЖЫТЛО

**Маладая беларускамоўная сям'я** зь дзіцем 6 гадоў здыме адносна таннае прыстойнае жытло ў Менску альбо пад Менскам (каб часта хадзілі электрацыя ці аўтобус). Разглядаюцца ЎСЕ варыянты. Т.: (029) 198–32–51

**Прадам** за 37 тыс. лецішча (вялікі драўляны дом, абкладзены цэглай (недабуд на 40%), з надзелам 6 сотак (1 км. ад МКАД)). Ёсьць электрычнасьць, вада (сэзонная), хуткая пэрспэктыва газу, крама, ходзяць менскія аўтобусы ды маршруткі. Т.: (029) 576–74–29 (тэлефануйце пасьля 10 красавіка).

### КАНТАКТЫ

**Паважаныя выпускнікі** фізычнага факультэту БДУ, гады навучаньня 1953—1958! Запрашаем вас на сустрэчу выпускнікоў! Сустрэча плянуецца на 5 чэрвеня 2008 г. Збор а 15–й на двары БДУ. Т.: (029) 171–80–05 (Галубовіч Валя), (029) 772–94–94 (Кірдун Ева), kirduneva@tut.by

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем у падарожжа** 13 красавіка (нядзеля) па маршруце: Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзясятнікі—Валожын. 20 красавіка (нядзеля): Сынкавічы—Слонім—Альба—Жыровічы—Ружаны—Косава; 8—11 траўня: «Скарбы Закарпацьця»: Ужгарад—Мукачаў—Навіцкая—Сярэдняе. Т.: (017) 292–54–58; (029) 622–57–20; 509–12–16; 110–19–28

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры, мове. Якасны набор, рэдагаваньне тэкстаў на беларускай мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: (029) 101–03–24. Юрась

**Філёляг** будзе ўдзячны за прыстойную працу, зьвязаную зь беларускай, польскай мовамі (выкладаньне, рэдагаваньне тэкстаў). Т.: (017) 294–13–38

**Шукаю** дылераў для распаўсюду па краіне беларускіх аўдыёкнігаў. Т.: (029) 944–83–55. E–mail: Guk_kniga@tut.by

### ВАШ РОД

**Дапаможам праверыць** шляхетнасьць Вашага роду. Рэканструкцыя фамільнага гербу. Т.: (029) 753–91–96, для лістоў: а/с 195, 220030, Менск, Беларусь. alesknigi@mail.ru

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Пратыя народнай свабоды, трудавікі і сацыял–дэмакраты галасавалі, каб не даваць таго мільёну рублёў на тайную паліцыю; але акцябрысты і правыя (каторых болей, як левых) аддалі галасы за тайную паліцыю і закон зацьвярдзілі.

**«Наша Ніва». №14. 1908**

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф–рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 09.04.2008.

Замова № 1924.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.